ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДАНЬНЯ XV
№ 124 (4376)
СУБОТА, 4 чэрвеня 1932 г.

МЕНСК, Савецкая 61

СЁНЬНЯ У НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—На штурм бездарожжа. Н. ЦЯРЭНЦЬЦЯЎ—Барацьба імпэрыялістаў за Ціхі акіян (2 стар.). УЛ. МЯЖЗВІЧ, Зьм. ПАВАРОТНЫ—Спэктакль рэвалюцыйнай зарадкі (3 стар.).

АБ ПЕРАБУДОВЕ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ БССР — Пастанова ЦК КП(б)Б. Пастанова сакратарыяту Беларускай Асацыяцыі Пралетарскіх Пісьменьнікаў (1 стар.).

Аб правядзеньні праполачнай і ўборачнай кампаніі — Пастанова калегіі Наркамзему і праўленьня Калгасцэнтру БССР (3 стар.).

ДРУГУЮ ПАЛОВУ ЯРАВОГА КЛІНУ ЗАСЕЯЦЬ У НАЙКАРАЦЕЙШЫ ТЭРМІН (1 стар.).

Мабілізуем новыя мільёны на выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, на заваяваньне подступаў да другой пяцігодкі (2 стар.).

Акупанты закрываюць апошнія беларускія гімназіі (4 стар.). Урадавы крызіс у Германіі (4 стар.).

НА ШТУРМ БЕЗДАРОЖЖА

Бездарожжа наносіць вялікія страты народнай гаспадарцы. Яно штучна адрэзвае прамысловыя, культурныя цэнтры ад тысяч вёсак, яно затрымлівае ўсё ўзрастаючыя грузапатокі паміж імі і ўскладняе працэс тэхнічнага аснашчэньня сельскай гаспадаркі.

У 1921 г. **Ленін** пісаў: «Паглядзеце на карту РСФСР. З поўначы ад Валогды, з паўднёвага ўсходу ад Растова на Дану, з поўдня ад Арэнбургу і ад Омску, з поўначы ад Томску ідуць неасяжныя прасторы... усюды, дзе дзесяткі вёрст прасёлка, вярней, дзесяткі вёрст бездарожжа аддзяляюць вёску ад чыгунак... няўжо не пераважвае ўсюды ў гэтых мясцох патрыярхальшчына, абломаўшчына, поўдзікасьць?»...

Там, дзе яшчэ ў 1921 г. панавала патрыярхальшчына—спадчына царскага панаваньня, сёньня вырасьлі заводы, фабрыкі, калгасы і саўгасы, разгортваецца гіганцкае будаўніцтва. Заваяваны і тысячы кілёмэтраў бездарожжа, па якіх ходзяць шмат аўтамабіляў, трактараў. Аднак, дарожнае будаўніцтва розка адстае ад тэмпаў і патрэб індустрыялізацыі краіны, калектывізацыі вёскі. Наколькі бездарожжа б'е па народнай гаспадарцы, досыць прывесьці хаця-б такія даныя. Перавозка адной тоны солі ў 1931 г. па прасёлачнай дарозе БССР абышлася ў чатыры разы даражэй, чым па шасэйнай на такой-жа адлегласьці. Калі да гэтага дадаць паломкі трактараў, машын, калёс, затрыманьні перавозак сельска-гаспадарчай таварнай прадукцыі з глыбінных пунктаў у пралетарскія цэнтры і тавараў у вёску, ускладненьне культурнай сувязі, дык стане зразумелым, якім бічом для народнай гаспадаркі зьяўляюцца дрэнныя дарогі. І таму ясна, чаму партыя і ўрад аддаюць вялікую ўвагу пытаньню дарожнага будаўніцтва.

Праведзены ў пачатку г. г. месячнік падрыхтоўкі да дарожнага будаўніцтва ня даў патрэбных вынікаў. Плян ня быў выкананы. Побач з перадавымі раёнамі—**Дрысенскім, Крупскім** і іншымі, рад раёнаў, як **Расонскі, Вузьдзенскі, Пухавіцкі, Віцебскі, Менскі,** яўна недаацанілі важнасьці месячніка і фактычна сарвалі вызначаны плян.

Самацёк замест канкрэтнага кіраўніцтва, ігнараваньне масава-палітычнай работы, культурна-бытавога абслугоўваньня і арганізаванага набору рабочай сілы, абязьлічка і ўраўнілаўка, дрэнная арганізацыя работы—вось асноўныя прычыны, якія сарвалі плян загатоўкі і вывазкі дарбудматар'ялаў.

Гэтыя ўрокі ня ўсюды ўлічаны. Зруху ў рабоце яшчэ няма. Да 25 мая каменьняў загатавана і падвезена да трасы 65 проц. пляну, гравія—12 проц., лесу—38 проц., пяску—16 проц. Тэмпы ганебна нізкія. Нарастаньне за пяціднёўку складае ўсяго 1 проц. Каб забясьпечыць выкананьне пляну, патрабуецца **неадкладна падвесьцярыць гэтыя тэмпы.**

Зусім нездавальняюча праходзяць па вучастках земляныя работы (выкананa 11 проц. пляну). Надзвычай марудна праходзіць брукаваньне—плян выкананa на 13 проц., россыпь шчэбню (4 проц. пляну) і ўкатка (2 проц.).

Скарыстаньне **мэханізмаў**—важнейшы сродак барацьбы за плян. **Галоўдартранс і Белдарбуд** не забясьпечылі поўнага скарыстаньня мэханізмаў, аўта і контранспарту. На 30 мая каткоў працавала па лініі толькі 40 проц. Камнядрабілкі працуюць толькі ў адну зьмену. З 7 машынадарожных атрадаў толькі 4 працуюць на вучастках дый тыя з перабоямі. Трактарны парк на 50 проц. не адрамантаваны.

Каб ліквідаваць прарывы ў дарожным будаўніцтве, цэнтральным штабам **па дарбудаўніцтве пры ЦК КП(б)Б абвешчан з 10 чэрвеня месячнік штурму.** На працягу гэтага месячніка будзе прыцягнута да ўдзелу ў дарожным будаўніцтве мясцовае насельніцтва на аснове выданага па гэтым пытаньні закону ЦВК і СНК БССР.

Плян удзелу працоўных у дарожным будаўніцтве павінен стаць сустаўной часткай вытворчых плянаў калгасаў, цесна ўвязан з асноўнымі гаспадарча-палітычнымі кампаніямі. Разгарнуць масава-палітычную работу, давесьці да кожнага калгасьніка і аднаасобніка плян месячніка, закон аб працудзеле насельніцтва—першачарговая важнейшая задача.

Абвешчаны месячнік штурму патрабуе ад дарожных арганізацый выключна ўдарнай, максымальна-выразнай работы. Трэба памятаць, што на працягу месячніка будзе скарыстаны на 100 проц. гадавы плян працоўнага ўдзелу насельніцтва—1.872.681 чалавека-дзён і 2.311.120 коня-дзён. Да 10 чэрвеня—пачатку месячніка—павінна быць праведзена дакладная падрыхтоўка, каб з першым масавым прыходам рабочай сілы і гужавога транспарту ня было ніякіх замінак у расстаноўцы іх.

Дарожным арганізацыям трэба дапамагчы. За дарбудаўніцтва адказваюць ня толькі дарожныя, але і мясцовыя партыйныя, савецкія і камсамольскія арганізацыі. ЦК КП(б)Б і СНК БССР у сваёй пастанове ад 27 мая аб мерах пакараньня за незабясьпячэньне бальшавіцкіх тэмпаў у разгортваньні работ па дарбудаўніцтве папярэджваюць райкомы і райвыканкомы, што «**ў выпадку няпрыняцьця рашучых мер да забясьпячэньня поўнага выкананьня плянаў дарбудаўніцтва ЦК і СНК вымушаны будуць ужыць больш рашучыя захады ў адносінах да кіраўніцтва адстаючых раёнаў**»

Важнейшую ролю павінны адыграць камсамольскія арганізацыі. ЦК ЛКСМБ абвясьціў усебеларускі **камсамольскі суботнік з 1 па 15 чэрвеня.** Арганізацыі дан лёзунг: **«Кожны камсамолец павінен падрыхтаваць ня менш 10 мэтраў дарогі».** РК і ячэйкі павінны наладзіць спаборніцтва на лепшы ўдзел у суботніку і дарбудаўніцтве.

Пастанова ЦК ЛКСМБ—баявая праграма работы ўсёй камсамольскай арганізацыі БССР. Трэба адзначыць добрую ініцыятыву **Менскай і Полацкай** камсамольскіх арганізацый, якія ўзяліся адпрацаваць на дарбудаўніцтве першая—15.000 працадзён і другая—12.000, **ВСФК БССР** абавязаўся даць 50 тыс. працадзён. Задача зараз заключаецца ў тым, каб абавязацельствы практычна ажыцьцёвіць.

Аўтадораўскія арганізацыі прымаюць зусім слабы ўдзел у дарожным будаўніцтве. Цэнтральны штаб пры ЦК КП(б)Б меў рацыю, калі ў сваёй апошняй пастанове прапанаваў ЦС Аўтадору БССР і ўсім ГК і РК КП(б)Б у дэкадны тэрмін узмацніць раённае зьвяно Аўтадору. Ячэйкі Аўтадору абавязаны прымаць канкрэтны ўдзел у дарбудаўніцтве, паказаўшы сапраўдныя ўзоры ў гэтай рабоце.

Прафарганізацыі праз перадачу вопыту сацыялістычных форм працы, праз наладжаньне суботнікаў могуць таксама аказаць вялікую дапамогу.

Галоўдартранс абвясьціў **конкурс** на лепшае правядзеньне месячніка. Справа гонару кожнай дарожнай арганізацыі, кожнай партыйнай і камсамольскай ячэйкі сельсавету, калгасу, вёскі, ячэйкі Аўтадору павінна стаць заваяваньне перадавога месца.

Палітычна-масавая работа, шырокае разгортваньне сацспаборніцтва, рэалізацыя шасьці ўмоў тав. Сталіна, правільная арганізацыя працы, культурна-бытавое абслугоўваньне, ліквідацыя абязьлічкі і ўраўнілаўкі, поўнае скарыстаньне мэханізмаў і транспарту—рашаючыя ўмовы выкананьня пляну дарбудаўніцтва.

Барацьба з бездарожжам сустракае жорсткае супраціўленьне з боку рэштак клясава-варожых элемэнтаў. Гэта супраціўленьне павінна і будзе рашуча задушана. Нам патрэбна рашучая барацьба з кулацкай агентурай, з правымі апартуністамі, са стаўкай на самацёк. Адначасова трэба папярэдзіць ад «лявацкіх» загібаў, ад падмены масава-палітычнай работы голым адміністраваньнем.

Посьпех месячніка будзе дасягнут, калі з боку адпаведных цэнтральных устаноў (Галоўдартранс, Белдарбуд, Калгасцэнтр і інш.) будзе забясьпечана апэрацыйнае кіраўніцтва месцамі. Тав. **Гікало** на партнарадзе па дарожным будаўніцтве сказаў: «**Задача заключаецца ў тым, каб пабольш бываць на мясцох, ахапіць важнейшыя вучасткі работы, апэрацыйна кіраваць, выпраўляць недахопы, дапамагаць у выпраўленьні іх і г. д.**». Менш дэкларацый, пастаноў, парадняснасьці і шумігі, больш канкрэтнай барацьбы за дарбудаўніцтва.

Па-бальшавіцку мабілізаваць масы на штурм бездарожжа! Чэрвень—ударны месяц барацьбы за добрую дарогу!

Другую палову яравога кліну засеяць у найкарацейшы тэрмін

ТЭМПЫ СЯЎБЫ ПА БССР ЗА МАЙ МЕСЯЦ (у гэкт. і проц.)

	2-я пяцідн.		3-я пяцідн.		4-я пяцідн.		5-я пяцідн.		6-я пяцідн.	
1932 год	145.540	5,4 проц.	245.560	9,1 проц.	491.568	18,3 проц.	875,218	32,5 проц.	1.417.504	52,9 проц.
1931 год	95.445	3,8 проц.	198.636	8,0 проц.	445.837	18,3 проц.	727.750	29,2 проц.	1.197.778	48,0 проц.

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

За бальшавіцкую мабілізацію мас, ударныя тэмпы сяўбы, выкананьне і перавыкананьне пасеўных пляпаў заносім на чырвоную дошку наступныя раёны:

1. **Жыткавіцкі** — выканаў плян сяўбы на **115 проц.**
2. **Чырвона-Слабодзкі** — выканаў плян сяўбы на **101,6 проц.**

Чырвоны сьпіс

кандыдатаў на прэміяваньне за лепшае і хутчэйшае правядзеньне веснавой сяўбы

Застаюцца ў чырвоным сьпісе кандыдатаў на прэміяваньне:

1. **Тураўскі** — выканаў плян сяўбы на 95 проц.; 2. **Старобінскі** — 80,8 проц. Дадаткова заносім кандыдатамі на прэміяваньне: 1) **Глускі** — 80,3 проц.; 2) **Чэрвеньскі** — 76,5 проц.

Ідуць параўнальна з іншымі раёнамі наперадзе: па паўднёвай зоне: 1) **Бабруйскі** — 76,2 проц.; 2) **Парыцкі** — 74,4 проц., 3) **Ельскі** — 71,9 проц.; па цэнтральнай зоне: 1) **Капыльскі** — 74,2 проц., 2) **Вузьдзенскі** — 71,6 проц.; па паўночнай зоне: 1) **Аршанскі** — 54,8 проц., 2) **Полацкі** — 53,7 проц., 3) **Лёзьнянскі** — 52,7 проц.

ЦК КП(б)Б—Гікало, СНК—Галадзеду, НКЗБ—Рачыцкаму, рэдакцыі „Зьвязда"

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА. (Па тэлефону). Чырвона - Слабодзкі раён у асноўным скончыў сяўбу яравых з перавыкананьнем пляну па асобных культурах. Плян НКЗБ — 16.690 га. На 31 мая засеяна 16.992 га, або 101,8 ПРОЦАНТАЎ ПЛЯНУ.

Па бульбе плян — 5.285 га, засеяна 5.289 га. Па аўсе плян — 4.298, засеяна 4.315. Па ячмені плян — 1.760, засеяна 1.941. Па ільне плян — 803 га, засеяна 825 га.

Сяўба працягваецца. Абвешчан пяцідзеньнік штурму па сяўбе махоркі і гародніх культур. Арганізавана масавая дапамога адстаючым калгасам. Абвешчан трохдзеньнік праверкі ўліку і запісу працадзён у працоўныя кніжкі калгасьнікаў, трохдзеньнік праверкі становішча ўборачнага інвэнтару і свалачсовай мабілізацыі мас на практычную падрыхтоўку да праполачнай і ўборачнай кампаніі.

Сакратар РК КП(б)Б КРАЦЭР
Загадчык райза ЧАРНІКЕВІЧ.

Дэкаднік штурму па ліквідацыі прарываў у выкананьні плянаў сяўбы па МТС

Пастанова Бюро ЦК ЛКСМБ ад 2 чэрвеня 1932 г.

Улічваючы пагражаючае становішча з выкананьнем пляну сяўбы, у асабліваści па лініі МТС, выканаўшых заданьне на 48 проц. і спабы ўдзел камсамолу ў правядзеньні пасеўнай кампаніі, бюро ЦК пастанаўляе:

Абвясьціць дэкаднік штурму камсамолу Беларусі па ліквідацыі прарываў ў выкананьні пляну сяўбы па МТС, разгарнуўшы яго па лініі правільнай расстаноўкі сіл, разгортваньня масава-растлумачальнай работы, арганізацыі сацспаборніцтва і ўдарніцтва ўнутры і паміж брыгадамі і калёнамі за эканомію гаручага, за павышэньне эфэктыўнасьці работы трактара, зьнішчэньне псаваньняў і прастояў яго, за павышэньне якасьці ворыва і сяўбы, мабілізаваўшы на выкананьне гэтага ўвесь камсамольскі актыў, забясьпечыўшы ў бліжэйшыя дні 100-процантнае выкананьне пляну сяўбы.

Зацьвердзіць прадстаўлены сьпіс цэнтральнага і менскага гарадзкога камсамольскага актыву, мабілізаванага для работы ў МТС да канца пасеўнай.

Для практычнай дапамогі ў рамонце трактарнага парку і ў мэтах бесьперабойнай работы трактараў накіраваць тэрмінам на адну дэкаду 220 камсамольскіх сьпісараў на работу ў МТС. Прапанаваць менскаму гаркому ў аднадзенны тэрмін мабілізаваць 60 камсамольцаў сьпісараў ня ніжэй 4-га разраду, віцебскаму ГК — 50 камсамольцаў, Гомельскаму — 60, Бабруйскаму — 10, Барысаўскаму — 10, Аршанскаму — 10, Магілёўскаму — 10 і Слуцкаму — 10.

Накіраваньне гэтых т. т. у МТС праводзіць па разнарадцы тав. Каршакевіча.

Для разгортваньня гэтай работы камандыраваць тэрмінам на 2 дні ў г. Гомель заг. арганізацыі ЦК ЛКСМБ тав. Камарова, у Віцебск — тав. Вальфсона і ў Бабруйск — тав. Гольдмана.

Адказнасьць за арганізацыю перакідкі людзей, штодзённую сувязь, атрыманьне і абагуленьне зводак з мясц, арганізацыю асьвятленьня ўсіх матар'ялаў у друку, сувязь з цэнтральнай пасеўнай тройкай і Трактарацэнтрам ускласьці на члена бюро ЦК ЛКСМБ тав. Смолікаву, вызваліўшы яе на гэты час ад выкананьня абавязкаў заг. аддзелам асьветы і кадраў ЦК ЛКСМБ.

Абавязаць усе ГК і РК ЛКСМБ у аднадзенны тэрмін перакінуць гарадзкі актыў у дапамогу МТС, разгарнуўшы адпаведную работу па ўмацаваньні камсамольскіх ячэек МТС.

Прапанаваць «Чырвонай зьмене» адвесьці спэцыяльную старонку для штодзённага асьвятленьня ходу штурму і выкананьня пляну сяўбы па лініі МТС.

Прапанаваць тав. Дубнікаву ў трохдзённы тэрмін падрыхтаваць і ўнесьці на абмеркаваньне сакратарыяту ЦК пытаньне аб арганізацыі ўсебеларускага рэйду лёгкай кавалерыі па праверцы падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі.

Безадкладна ліквідаваць адставаньне ў сяўбе—баявая задача камсамолу

Разгортваньне і ход сяўбы па раду раёнаў сыгналізуе аб яўна слабай рабоце камсамолу на гэтым вучастку.

Такое становішча ў далейшым нецярпіма і патрабуе рашучых мер, якія-б забясьпечылі бальшавіцкую работу ленінскага камсамолу Беларусі ў правядзеньні гэтай адказьнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі.

Рэалізуючы важнейшыя пастановы партыі, перабудаваўшы свае рады, кожны камсамолец, ячэйка і камітэт павінны забясьпечыць поўнае выкананьне заданьняў партыі па сяўбе і падрыхтоўцы да ўборачнай.

ЦК нашай партыі правільна патрабуе і абавязвае камсамольскія арганізацыі працаваць значна лепш з тым, каб сапраўды на справе апраўдаць год пасьль яе лепшага і вернага дапаможніка.

Абвешчаны ЦК ЛКСМБ дэкаднік штурму на выкананьні пляну сяўбы, у асабліваści па лініі МТС, павінен пакласьці пачатак правільнай расстаноўцы камсамольскіх сіл у брыгадах, разгортваньню сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, правядзеньню разгорнутай масавай палітычнай работы ў брыгадах, калгасах і МТС на аснове апошніх пастаноў партыі і ўраду аб с.-г. падатку, загатоўках і калгасным тандлі.

Увесь камсамольскі актыў трэба мабілізаваць на тое, каб у бліжэйшыя дні дабіцца поўнага выкананьня пляну сяўбы. Кожны камсамолец, над кіраўніцтвам партыйнай ячэйкі павінен зьявіцца рашаючай сілай у брыгадзе пры правядзеньні гэтай важнейшай задачы.

Прыпытае камсамолам абавязацельства — рапартаваць пленуму ЦК ЛКСМБ і 7-й усесаюзнай канфэрэнцыі камсамолу аб поўным і свалачсовым скончэньні сяўбы—павінна быць выканана. Трэба адкрыць рашучы агонь па кіраўніцтве і людзях у камсамоле, якія, прыняўшы перад партыяй і саюзам абавязацельствы, не пераўтвараюць іх у канкрэтную справу. Трэба дабіцца ў арганізацыі такога становішча, каб кожнае самаабавязацельства камсамольцаў і арганізацыі ў цэлым было-б па-бальшавіцку, няўхільна выканана.

Камсамольскі штурм, ліквідацыя адставаньня ў сяўбе па лініі МТС павінен дамагчы арганізацыйнаму афармленьню і ўмацаваньню камсамольскіх ячэек МТС з тым, каб зрабіць іх сапраўды моцнымі апорнымі, каб па ячэйках пры МТС раўняліся ўсе калгасныя ячэйкі камсамолу. ЦК ЛКСМБ упэўнен, што кожны камсамолец, уся арганізацыя ў цэлым усьвядомяць сур'ёзнасьць становішча і ліквідуюць запазычанасьць па сяўбе, на справе да памогуць па толькі выканаць, але і перавыканаць пляны, вызначаныя партыяй і ўрадам.

ЦК ЛКСМБ заклікае ўсе арганізацыі дапамагчы камсамолу ў правядзеньні штурму.

Барацьба за сяўбу—барацьба за тэнэральную лінію партыі. Ленінскі камсамол, які давёў сваю адданасьць партыі, аказацца не верным і вартым памочнікам і на гэтым важнейшым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва.

ЧОРНАЯ ДОШКА

За невыкананьне пастановы ЦК КП(б)Б ад 27 мая, за адсутнасьць бальшавіцкай барацьбы ў справе мабілізацыі мас на свалачсовае скончэньне плянаў трэцяй бальшавіцкай вясны, **пакідаем на чорнай дошцы наступныя раёны:**

ПА ПАЎДНЁВАЙ ЗОНЕ (сярэдні проц. выкананьня 57,8):

1) **Уваравіцкі** — 30,4 проц., 2) **Нараўлянскі** — 35,9 проц., 3) **Чачэрскі** — 43,5 проц., 4) **Веткаўскі** — 48 проц., 5) **Рэчыцкі** — 48,2 проц.

За зьніжэньне тэмпаў сяўбы **дадаткова заносім на чорную дошку:**

1) **Камарынскі** — 33,3 проц., 2) **Лоеўскі** — 37,6 проц.

ПА ЦЭНТРАЛЬНАЙ ЗОНЕ (сярэдні процант выкананьня 55,2):

Пакідаем на чорнай дошцы: 1) **Прапойскі**—44 проц., 3) **Бягомльскі**—36,5 проц., 3) **Чырвонапольскі**—48,2проц., 4) **Талачынскі**—45 проц., 5) **Касьцюковіцкі**—52,6 проц.

За зьніжэньне тэмпаў сяўбы дадаткова заносім на чорную дошку:

1) **Смалявіцкі** — 45,3 проц.

ПА ПАЎНОЧНАЙ ЗОНЕ (сярэдні проц. выкананьня 42,4):

Пакідаем на чорнай дошцы: 1) **Сураскі** — 23,6 проц., 2) **Бешанковіцкі** — 37 проц.

За зьніжэньне тэмпаў сяўбы дадаткова заносім на чорную дошку:

1) **Вушацкі** — 21,4 проц.

Пакідаем на чорнай дошцы раёны буйных пралетарскіх цэнтраў БССР:

1) **Гомельскі** — 42,9 проц. (паўднёвая зона).

2) **Віцебскі** — 34,9 проц. (паўночная зона).

«З боку кіраўніцтва гэтай групы раёнаў не ўсьвядомлена ўся важнасьць работы па свалачсовым выкананьні плянаў трэцяй бальшавіцкай вясны» (з пастановы ЦК КП(б)Б ад 27 мая).

Гомельская і **Віцебская** партарганізацыі **на справе не паказалі** бальшавіцкай мабілізаванасьці на ліквідацыю ганебнага адставаньня. Гомельскі раён з 25-га месца на зоне прасунуўся наперад па 21 месца, Віцебскі — з 15 толькі на 14-ае.

Задача ўсіх раёнаў, занесеных на чорную дошку, **у бліжэйшыя-ж дні ліквідаваць прарывы,** выйсьці ў рад перадавых па фронце пасеўнай.

ЗЬНІМАЮЦЦА З ЧОРНАЙ ДОШКІ

За ліквідацыю адставаньня ў ходзе веснавой сяўбы **зьнімаюцца з чорнай дошкі** 5 наступных раёнаў: 1. **Чавускі 57 проц.** выкананьня пляну), які за апошнюю пяціднёўку па цэнтральнай зоне вышаў з 28 месца па 5 месца; **Быхаўскі—(57,7 проц.)** вышаў з 31 на 16 месца; **Полацкі—(53,7 проц.)** па паўночнай зоне вышаў з 13 на 2 месца, **Гарадоцкі—(47 проц.)** вышаў з 13 на 5 месца **Магілёўскі** (58,5 проц.); **Бялыніцкі** (60 проц.).

Асобна адзначаем зьняцьце з чорнай дошкі **Менскага** раёну (61,4 проц.), які за пяціднёўку даў прырост па **35,9 проц.** і вышаў па цэнтральнай зоне з 25 на 11 месца.

Перад раёнамі, якія зьнімаюцца з чорнай дошкі, самае цяжкае па выкананьні плянаў застаецца наперадзе. Адэтуль, не аслабляючы, а наадварот, яшчэ больш узмацняючы тэмпы сяўбы, партарганізацыі ў бліжэйшую пяціднёўку павінны прыйсьці да канчатковых перамог са 100-процантным выкананьнем пасеўпляну.

ЗВОДКА НКЗБ

аб ходзе сяўбы па раёнах БССР на 30 мая 1932 году

№ №	РАЁНЫ:	Усяго засеяна ў проц.	У тым ліку (проц.) Збожжа.	Ільну	Канапель	Бульбы	Карм. корнаплод	Траў
	Паўднёвая зона							
1.	Жыткавіцкі	115,0	135,5	115,5	61.8	110,8	59,1	6,0
2.	Тураўскі	95,0	112,5	122,9	42,6	85,4	74,5	9.2
3.	Старобінскі	80,8	93,7	81,1	35,0	90,0	24,4	11,1
4.	Глускі	80,3	85,7	82,6	62,4	90,9	38,8	51,8
5.	Бабруйскі	76,2	84,0	75,9	81,3	83,5	31,6	27,0
6.	Парыцкі	74,4	77,0	103,3	51,0	81,1	19,9	46,0
7.	Ельскі	71,9	63,1	106,5	63,4	85,6	39,6	23,6
8.	Буда-Кашалёўскі	67,4	81,7	83,5	20,4	67,4	17,9	21,4
9.	Брагінскі	64,0	75.1	72,5	12,1	65,6	37,2	22,2
10.	Лельчыцкі	63,3	68,3	86,5	53,5	64,3	9,4	—
11.	Любаньскі	63,3	74,8	102,5	6,9	83,7	4,8	2,7
12.	Рагачоўскі	61,8	71,5	60,9	23,8	63,5	19,8	13,9
13.	Церахаўскі	60,0	67,5	72,8	10,9	54,9	50,3	11,7
14.	Мазырскі	58,3	51,1	82,5	42.9	67,2	22,2	15,3
15.	Жлобінскі	55,5	59,4	64,5	23,3	64,2	21,0	12,2
16.	Хойніцкі	50,5	64,0	62,2	20,4	52,2	18,6	22,8
17.	Кармянскі	50,2	59,8	44,0	0,8	54,9	18,9	18,4
18.	Рэчыцкі	48,2	52,6	64,3	3,3	55,1	13,4	31,5
19.	Веткаўскі	48,0	49,5	58,0	3,9	50,8	24,4	23,7
20.	Чачэрскі	43,5	49,0	59,3	0,8	43,6	7,1	85,1
21.	Гомельскі	42,9	51,7	61,0	22,0	54,6	30.1	10,7
22.	Пятрыкоўскі	41.0	35,2	61,6	14,1	62,8	26,3	10,1
23.	Лоеўскі	37,6	41,8	57,3	1,7	47,9	7,0	7,3
24.	Нараўлянскі	35,9	33,7	57,3	17,2	54,8	12,0	5,8
25.	Камарынскі	33.3	46,8	38,2	11,8	37,0	8,8	14.9
26.	Уваравіцкі	30,4	40,4	10,8	4,4	29,0	9.9	6.8
	Усяго па зоне	**57,8**	**63,7**	**66,8**	**20,9**	**65,5**	**24,3**	**19,8**
	Цэнтральная зона							
1.	Чырвона-Слабодзкі	101,6	112,1	94,9	79,0	102,3	68,9	78,9
2.	Чэрвеньскі	76,5	81,8	60,1	47,2	88,4	36,4	40,1
3.	Капыльскі	74,2	102,7	32,8	40,0	65,9	31,1	38,9
4.	Вузьдзенскі	71,6	81,0	30,3	44,1	75,8	20,8	18,9
5.	Чавускі	57,0	64,5	48,1	0,7	67,7	11,4	8,5
6.	Слуцкі	66,9	74,2	44,4	46.2	74,9	34,3	41,2
7.	Клічаўскі	66,6	81,0	50,5	28,8	65,1	5,2	23,8
8.	Крычаўскі	64,2	76,2	54,2	2,4	71.5	13.8	20,8
9.	Пухавіцкі	63.9	75,2	58,3	48,4	66,8	18,2	31,0
10.	Асіпавіцкі	62,0	67,8	52,6	35,2	68,7	12,1	8,7
11.	Менскі	61,4	87,5	44,5	—	63,9	23,5	25,2
12.	Клімавіцкі	64,8	66,7	53,9	16,1	69,5	22,8	34,6
13.	Горацкі	59,2	78,8	40,2	1,9	62,9	13,2	22,2
14.	Мсьціслаўскі	58,6	66,6	56,4	12,8	64,6	4,1	21,9
15.	Лагойскі	57,8	69,7	29,8	36,3	58,1	17,8	33.5
16.	Быхаўскі	58,4	60,0	65,0	—	71,0	4,4	10,9
17.	Заслаўскі	54,4	66,4	24,1	28,2	67,2	19.5	22,7
18.	Чэрыкаўскі	53,9	50,0	57,8	5,6	65,1	17,6	11,0
19.	Барысаўскі	53,5	58,0	18,3	22,7	67,5	12,3	21,8
20.	Шклоўскі	52,7	58,9	48,7	—	58,0	23,2	29.8
21.	Магілёўскі	58,5	55,9	47,0	4,3	68,7	10,0	10,2
22.	Бярэзінскі	51,7	51,1	52,9	28,8	65,9	5,2	18,4
23.	Касьцюковіцкі	52,6	53,1	57,4	0,5	66,4	16,7	16,1
24.	Плешчаніцкі	51.4	51,3	14,8	7,9	76,7	6,7	27,8
25.	Койданаўскі	50,9	56,2	12,3	21,4	70,1	25,6	32,8
26.	Крупскі	47,7	50,7	20,7	11,8	75,5	18,4	7,6
27.	Стараградоскі	46,3	59,5	38,9	20,0	44,7	6,5	6,6
28.	Смалявіцкі	45.3	46,6	29,6	26,6	58,9	13,4	26.1
29.	Талачынскі	45,0	58,2	23,5	9,1	51,3	13,0	14,7
30.	Чырвонапольскі	48,2	33,1	66,4	—	46,2	—	16,2
31.	Бягомльскі	36,5	39,4	3,2	—	46,3	2,5	8,3
32.	Прапойскі	44,0	63,7	24,8	—	25,7	2,1	9,0
33.	Бялыніцкі	60,0	34,3	1,2	—	18,2	2,4	9,2
	Усяго па зоне	**55,2**	**62,2**	**41,4**	**10,4**	**53,9**	**17,7**	**24,1**
	Паўночная зона							
1.	Аршанскі	54,8	70,0	40,8	3,8	50,7	19,0	30,0
2.	Полацкі	53,7	62,4	41,7	—	68,1	23,0	29,9
3.	Лёзьнянскі	52,7	59,5	58,5	—	69,6	29,4	35,8
4.	Сіроцінскі	47,1	54,2	44,5	—	44,2	17,2	1,0
5.	Гарадоцкі	47,0	57,9	37,3	—	48,6	17,7	8,6
6.	Сеньненскі	46,6	52,8	48,3	—	53,8	8,5	21,0
7.	Асьвейскі	41,8	54,8	25,0	—	50,0	3,3	18,8
8.	Расонскі	40,1	58,6	24,8	—	46,4	10,4	15,3
9.	Дубровенскі	39,0	50,1	31,1	—	44,8	10,7	16,5
10.	Лепельскі	38,5	49,5	24,7	7,7	41,4	20,8	12,3
11.	Бешанковіцкі	37,0	38,6	66,9	1,3	57,2	33,3	11,2
12.	Дрыбенскі	35,7	41,9	30,7	—	43,0	7,0	31,9
13.	Чашніцкі	35,2	45,8	18,3	14,0	42,7	11,8	22,0
14.	Віцебскі	34,9	43,4	2,2	—	35,5	22,0	9,5
15.	Сураскі	23,6	35,2	17,2	—	24,0	5,1	13,1
16.	Вушацкі	21,4	24 9	15,8	—	30,9	1,7	19,8
	Усяго па зоне	**42,4**	**52,0**	**32,7**	**5,9**	**46,7**	**16,7**	**18,1**
	Усяго па БССР	**52,9**	**60,4**	**40,9**	**16,4**	**60,8**	**19,0**	**21,7**

Кіраўнік пасеўбюро НКЗБ ТАРАСЕВІЧ.

АБ ПЕРАБУДОВЕ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ БССР

Пастанова ЦК КП(б)Б

*1. ЦК КП(б)Б адзначае сваячасовасьць і вялізарнае палітычнае значэньне пастановы ЦК УсеКП(б) ад 23 красавіка г. г. аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый, якая будзе садзейнічаць яшчэ большаму аб'яднаньню шырокіх колаў савецкіх пісьменьнікаў і мастакоў вакол камуністычнай партыі, яшчэ большай мабілізацыі на актыўны ўдзел у пабудове бясклясавага с

На нарадзе пры „Зьвязьдзе“

КЛІЕНТУРА ДА АСЕНЬНЯ-ЗІМОВЫХ ПЕРАВОЗАК НЯ РЫХТУЕЦЦА

Асеньня-зімовыя перавозкі бягучага году ставяць перад транспартам надзвычай адказныя задачы. У чацьвертым кварталe кругласутачная нагрузка павінна быць даведаена да 65.000 вагонаў. Такі аб'ём перавозак патрабуе самай выразнай работы ад усіх зьвеньняў транспарту, у тым ліку і ад кліентуры. Своячасовая падрыхтоўка да асеньня-зімовай кампаніі перавозак патрабуецца як ад транспарту, так і ад кліентуры.

З мэтай выяўленьня падрыхтоўкі кліентуры да асеньня-зімовых перавозак, «Зьвязда», разам з упаўнаважаным НКШЗ пры СНК БССР і трыкутнікам Менскага чыгуначнага вузла правяла 29 мая нараду.

Упаўнаважаны НКШЗ тав. **Згле** ў сваім дакладзе ўказаў на тыя дасягненьні, з якімі сустракае чыгуначны транспарт перавозкі гэтага году. Нагрузка з кожным месяцам расьце, перавыконваючы заданыя нормы. Калі ў маштабе дарог усяго Саюзу нагрузка гэтага году параўнальна з мінулым узрасла на 26-27 проц., дык па раёнах Беларусі яна ўзрасла больш, чым на 30 проц. Аднак, для таго, каб выканаць план асеньня-зімовых перавозак, патрабуецца значна большае ўзмацненьне тэмпаў работы, рашучае зьнішчэньне тых недахопаў, якіх на транспарце яшчэ многа. Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на поўную рэалізацыю 6 умоў тав. Сталіна, на максымальную мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў, на найбольш эфэктыўнае скарыстаньне транспартных сродкаў і г. д.

Кліентура яшчэ не павярнулася тварам да транспарту. Няправільнае скарыстаньне рухомага складу, непрадукцыйныя прастоі вагонаў пад нагрузкай і выгрузкай, сустрэчныя перавозкі, дрэнная арганізацыя нагрузачна-разгрузачных работ і інш.,—вось асноўныя недахопы.

На нарадзе выявілася, што кліентура яшчэ не прыступіла да падрыхтоўкі да асеньня-зімовых перавозак. Ні адзін з прысутных на нарадзе прадстаўнікоў ня мог канкрэтна паведаміць аб складзеных плянах, аб вызначаных мерапрыемствах, якія праводзяцца па падрыхтоўцы складаў, па арганізацыі нагрузачна-разгрузачных работ, па камплектаваньні рабочай сілы і г. д. З боку раду ўстаноў і аб'яднаньняў наглядаецца поўная недацэнка справы своячасовай падрыхтоўкі да асеньня-зімовых перавозак. Яшчэ пануюць старыя погляды, што перавозкі—справа транспарту і кліентура тут ня прычым. Толькі недацэнкай можна вытлумачыць, што на нараду не зьявіліся прадстаўнікі такіх буйнейшых аб'яднаньняў, як **Белгаапсаюз, Белдзяржснаб, Наркамзем,** а таксама прадстаўнікі **камгасу, заводу імя Варашылава, фабрык «Камунарка», абутковай, шпалернай і інш.**

Найбольш яркі ўзор неразуменьня адказнасьці кліентуры за падрыхтоўку да асеньня-зімовых перавозак паказала **Заготзбожжа** — арганізацыя, якая павінна была паказаць прыклад сапраўднай падрыхтоўкі, бо ў часе асеньня-зімовых перавозак удзельная вага яе грузаў будзе займаць значнае месца ў агульным пляне. Прадстаўнік гэтага аб'яднаньня тав. **Бубёнаў** заявіў на нарадзе, што Заготзбожжа ня можа нічога паведаміць нарадзе аб канкрэтных мерапрыемствах па падрыхтоўцы да асеньня-зімовых перавозак, бо яно займецца распрацоўкай гэтага пытаньня толькі пасьля таго, як камандыраваны ў Маскву прадстаўнік прывязе дырэктывы. Больш бюракратычнага падыходу да адказьнейшай кампаніі цяжка знайсьці.

Каб сустрэць асеньня-зімовыя перавозкі ва ўсеўзбраеньні, трэба максымальна скарыстаць летні пэрыяд, каб фарсаваць перавозку тых грузаў, якімі нельга будзе загружаць транспарт у часе асеньня-зімовага патоку, трэба разгрузіць складачныя памяшканьні і пакгаўзы ад грузу і г. д. На нарадзе выявілася, што кліентура не скарыстоўвае спрыяючага пэрыяду летняга часу для перавозкі грузаў. **Заготзбожжа, Экспартхлеб, Белплодагародніна, МЦРК, Наркамзем і Белкаапсаюз** не прад'яўляюць транспарту грузаў. Яны таксама ўхіляюцца ад папярэдняга фронту нагрузкі, выклікаючы гэтым непрадукцыйныя прастоі вагонаў. Апошняе наглыбляецца яшчэ і тым, што нагрузачна-разгрузачныя работы не мэханізаваны. Амаль на ўсіх станцыях ёсьць транспарцёры, але яны гадамі стаяць без работы, іржавеюць (ст. Менск і інш.). Кіраўніцтвы станцый у большасьці спасылаюцца на адсутнасьць электраматораў. Між тым, можна прыстасаваць рухавікі ўнутранога згараньня і зусім лёгка скарыстоўваць каштоўныя мэханізмы.

Як на ўзор дрэннай арганізацыі гэтай работы, паказвалі на тое, што на Белдрэс торф грузіцца ў вагоны кошыкамі. У выніку прастоі вагонаў пад нагрузкай замест 22 гадзін дасягае 33 і больш. Кліентура ня прымае мер да своячасовай выгрузкі і вывазкі грузу. Менскі вузел літаральна завален грузамі. Да 1.900 вагонаў ня вывезены кліентурай.

Складачныя памяшканьні ў кліентуры яшчэ ня прыведзены ў належны парадак. Да будаўніцтва новых, там, дзе гэта патрэбна, яшчэ ня прыступлена. Пад'язныя шляхі як да чыгунак, так і да складачных памяшканьняў у нездавальняючым стане і патрабуюць неадкладнага рамонту. Ня выконваецца таксама дырэктыва аб маршрутызацыі цагнікоў. Кліенты ня хочуць лічыцца з гэтай сыстэмай най больш рацыянальнага скарыстаньня рухомага складу. Не прыступлена таксама да мабілізацыі тары.

Вялікая адказнасьць ускладаецца на мясцовы транспарт. Прадстаўнік Саюзтрансу паведаміў, што па іх лініі сёе-тое зроблена па падрыхтоўцы да асеньня-зімовых перавозак. Павялічваецца аўта-гужавы транспарт на 20 адзінак. Вызначаны рад іншых мерапрыемстваў. Аднак, Саюзтранс нічога не зрабіў да забесьпячэньня своячасовай разгрузкі станцыі ад грузаў. Саюзтранс яшчэ не ахапіў у поўным аб'ёме ўсіх пытаньняў падрыхтоўкі.

Кліентура прад'явіла на гэтай нарадзе свой рахунак і транспарту. Тав. Рабіновіч, Цярэшчанка, Палей і інш. указвалі на рад фактаў нявыразнай работы транспарту. Кліентуры своячасова не паведамляюць аб прыбыцьці грузаў. Ёсьць яшчэ рад фактаў несвоячасовай падачы вагонаў і г. д. Усё гэта правільна. Недахопаў яшчэ шмат як у адных, так і ў другіх. Задача заключаецца ў тым, каб пабальшавіцку ўзяцца за зьнішчэньне недахопаў як па лініі транспарту, так і па лініі кліентуры, каб неадкладна, не чакаючы ніводнага дня, прыступіць да падрыхтоўкі да асеньня-зімовых перавозак па ўсім фронце.

Нарада прыняла канкрэтныя прапановы: абавязаць кліентуру на працягу аднэй дэкады скласьці выразныя пляны перавозак, а міжведамственная нарадзе па плянаваньні пры Дзяржпляне дакладна іх прапрацаваць; максымальна скарыстаць летні пэрыяд для перавозак грузаў; на працягу блізкайшых дзён прыступіць да падрыхтоўкі старых складачных памяшканьняў і зараз-жа распачаць пабудову новых, дакладна вызначыўшы пункты пабудовы іх; неадкладна разгарнуць работу па камплектаваньні рабочай сілы для нагрузачна-разгрузачных работ, максымальна фарсаваць мэханізацыю гэтых работ; ужо зараз прыступіць да рамонту пад'язных дарог да чыгункі і складачных памяшканьняў.

Нарада прызнала неабходным, каб па ўсіх станцыях і раёнах былі праведзены падобныя нарады кліентуры з адміністрацыяй чыгунак. Пастаноўлена ў самы кароткі час склікаць паўторную нараду, дзе заслухаць інфармацыю кліентуры аб праведзеных канкрэтных мерапрыемствах на падрыхтоўцы да асеньня-зімовых перавозак, папярэдня правёўшы масавыя рэйды праверкі гэтага.

Р. К.

Ударнікі-камсамольцы т. т. Брудно, Шлегель і Капылоў арганізавалі брыгаду «Дагнаць і перагнаць» на заводзе «Полымя Рэвалюцыі»

Мабілізуем новыя мільёны на выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, на заваяваньне подступаў да другой пяцігодкі

Заводы, фабрыкі і МТС БССР галасуюць за новую пазыку імя 4-га, заключнага

У адказ імпэрыялістам і сацыял-Гаргулавым

Пад кіраўніцтвам сталёвай ленінскай партыі і яе ЦК, на чале з тав. Сталіным, Савецкі саюз ідзе ад перамогі да перамогі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. Захоўваючы палітыку міру, СССР змагаецца за заваяваньне подступаў да другой пяцігодкі — калі будзе пабудавана бясклясавае сацыялістычнае грамадзтва, калі будуць зьнішчаны карэньні капіталізму.

Посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва на Крычаўшчыне, былым закінутым кутку, прыгнечанай царскай уладай Беларусі — наглядна адлюстроўваюць вялізарную ролю ленінскай нацыянальнай палітыкі на шляху пераўтварэньня адсталай акраіны б. царскай імпэрыі ў перадавую індустрыяльна-аграрную краіну.

На Крычаўшчыне пабудаваны фосфарны млын, крэйдавы завод, ільнозавод, цацельня; канчаецца будаўніцтва цэмэнтнага гіганту — аднаго з «518». 6.000 рабочых працуюць там, дзе раней працавалі дзесяткі.

Мы будуем на свае ўласныя сродкі, не чакаючы ніякай дапамогі з боку замежных краін. З году ў год рабочыя сваімі сродкамі дапамагаюць савецкай уладзе разгортваць індустрыялізацыю і сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі. Мы паставілі сваёй мэтай дагнаць і перагнаць перадавыя ў тэхнічных адносінах капіталістычныя краіны і ва што-б там ні стала даб'ецца гэтага.

Задачы чацьвертага заключнага году патрабуюць далейшай мабілізацыі сродкаў працоўных. Мы, рабочыя, ІТР **Крычаўскага цэмэнтнага заводу** перавыканалі кантрольнае заданьне па пазыцы «Трэці рашаючы». Мы зараз просім урад Саюзу выпусьціць новую пазыку імя чацьвертага заключнага. Пастанаўляем: **даць краіне ў пазыку ня менш акладу месячнага заработку. Выклікаем усе прадпрыемствы, МТС, саўгасы і калгасы падтрымаць нашу просьбу.**

На правакацыі белых бандытаў, якія падтрымліваюцца імпэрыялістычнымі ўрадамі і сацыял-Гаргулавымі, адкажам дапамогай савецкаму ўраду.

Пад кіраўніцтвам партыі — да новых перамог!

Па даручэньні агульнага сходу рабочых Крычаўскага цэмэнтнага заводу—ШОЛКАЎ, ПРАДКО, БЭРХМАН і БРАЖЫНСКІ.

Варашылаўцы падтрымліваюць выклік перадавікоў

Учора на машына-будаўнічым заводзе ІМЯ ВАРАШЫЛАВА адбыўся агульна-заводскі мітынг па пытаньні аб выпуску новай пазыкі. На мітынгу была прынята рэзалюцыя, у якой гаворыцца: **«МЫ ДАЛУЧАЕМСЯ ДА ПРОСЬБАЎ ПРАЦОЎНЫХ АБ ВЫПУСКУ НОВАЙ ПАЗЫКІ. ЗАКЛІКАЕМ УСІХ РАБОЧЫХ, РАБОТНІЦ, КАЛГАСЬНІКАЎ І ПРАЦОЎНЫХ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ ПАДТРЫМАЦЬ ІНІЦЫЯТЫВУ ПЕРАДАВІКОЎ.**

Мы бярэм на сябе абавязацельствы па-ўдарнаму выканаць і перавыканаць кантрольнае заданьне, якое будзе дана нашаму заводу.

Ніводнага рабочага, работніцы, калгасьніка і працоўнага селяніна—аднаасобніка бяз новай пазыкі!

Няхай жыве камуністычная партыя—правадыр і арганізатар пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва!

Няхай жыве ленінскі ЦК на чале з правадыром партыі і рабочай клясы тав. Сталіным!»

Паскорыць выпуск пазыкі

МАСКВА.

Сход партыйнага, прафсаюзнага, гаспадарчага і камсамольскага актыву КУЗНЕЦКАБУДУ сумесна з рабочымі ўдарнікамі і інжынэрна-тэхнічнымі работнікамі аднагалосна пастанавіў зьвярнуцца ад імя 50.000 рабочых і ІТР будаўніцтва да ўраду з просьбай паскорыць выпуск новай пазыкі для далейшага ўмацаваньня і разгортваньня новых гігантаў.

З аналёгічнай просьбай зьвярнуліся да ўраду ўдарнікі рабочыя ІТР і служачыя дзейных цэхаў уральскага заводу цяжкага машынабудаўніцтва, байцы і камандзіры №-скага асобнага артдывізіёну, а таксама рабочыя і ІТР і служачыя Штэрэўскай ДРЭС, экіпаж параходу Каспфлёту «Прафінтэрн», 4000 рабочых Ташкенскага паравоза-вагонна-рамонтнага заводу, рабочыя і інжынэрна-тэхнічны пэрсанал Харкаўскага трактарнага заводу імя т. Арджанікідзе і інш.

Дамо новыя сродкі на індустрыялізацыю краіны

Каб з посьпехам працягваць сацыялістычнае будаўніцтва, нам неабходны вялікія сродкі. Аднэй з магутных крыніц сацыялістычных накапленьняў зьяўляецца пазыка. Сёньня ў дзень скапчэньня аплаты пазыкі імя 3-га рашаючага году пяцігодкі мы ставім перад урадам СССР пытаньне аб выпуску новай пазыкі імя 4-га, заключнага году пяцігодкі. Новая пазыка дасьць магчымасьць па-бальшавіцку выканаць вялізарныя задачы апошняга году пяцігодкі і заваяваць подступы да другой пяцігодкі.

Мы, рабочыя **Танежыцкай МТС Чырвона - Слабодзкага раёну,** заклікаем далучыцца да нашай прапановы ўсіх працоўных БССР.

За пасьпяховае завяршэньне першай сацыялістычнай пяцігодкі за чатыры гады!

Няхай жыве УсеКП(б) і яе правадыр тав. Сталін!

Ад імя агульнага сходу рабочых Тачежыцкай МТС — ПРЭЗЫДЫУМ.

Тэлеграма

— АДЗНАЧАЮЧЫ ВЯЛІЗАРНАЕ ЗНАЧЭНЬНЕ ПАЗЫК НА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ БУДАЎНІЦТВА, ПЕРШЫ РАЁННЫ ЗЬЛЕТ УДАРНІКАЎ ФІНАНСАВАГА ФРОНТУ — КАМСАМОЛЬЦАЎ **БАБРУЙСКАГА РАЁНУ** ХАДАЙНІЧАЕ ПЕРАД УРАДАМ САЮЗУ АБ ВЫПУСКУ НОВАЙ ПАЗЫКІ ІМЯ ЧАЦЬВЕРТАГА ЗАКЛЮЧНАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ.

Ад імя зьлёту: ГЕРШМАН, РОХКІН, ЛЁЗНЫ, ЕНДЗЫН, ГРЫНШТЭЙН, БЕЛЕНЬКАЯ, АСТАНАВІЦКАЯ, ГАРЭЛІК, ГЕРШКОВА, КОПЕЛЬ.

Ад імя 1.500 лесарубаў і возчыкаў

ЧЭРВЕНЬ. Улічваючы вялізарны рост сацыялістычнага будаўніцтва і неабходнасьць вялікіх капітальных укладаньняў у прамысловасьць і сельскую гаспадарку, агульны сход саюзу лесдрэўрабочых Чэрвеньскага раёну ад імя 1.500 лесарубаў, возчыкаў, плытагонаў, падсочнікаў, ІТР і работнікаў лесрабкопу просіць савецкі урад выпусьціць новую пазыку пад назвай **«Чацьверты заключны год пяцігодкі».** Мы выплацілі падпіску на пазыку «Трэці рашаючы». Абяцаем усе, як адзін, падпісацца на новую пазыку ў разьмеры месячнага акладу.

Па даручэньні агульнага сходу— Чарны, Самец і Белы.

Рапарт

ЦК КП(б)Б—т. ГІКАЛО, СНК—т. ГАЛАДЗЕДУ, Наркамфін—т. ХАЦКЕВІЧУ, «Зьвязьдзе»

Заслаўскі раён выканаў абяцаньне, данае вышэйшым партыйным і савецкім органам аб датэрміновым выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў другога кварталу. На 1 чэрвеня Заслаўшчына выканала фінплян другога кварталу на 104,9 проц. Бальшавіцкае змаганьне за перавыкананьне плянаў працягваецца.

РК КП(б)Б — КУДЗЕЛЬСКІ.
РВК — ЦАЛКОЎ.
Райфа — БЭРМАН.

Упарадкаваць вытворчасьць і гандаль прахладжальнымі напіткамі

У вытворчасьці і гандлі фруктовымі водамі і квасам поўны хаос. Толькі галавацяпствам з боку некаторых работнікаў Белбродаб'яднаньня, Белпрам саюзу, Белкаапсаюзу можна тлумачыць тое, што ля кіёскаў за апошні час наглядаецца чарга, што квасу і вод не хапае.

Работнікі прамкаапэрацыі і Белброд аб'яднаньня, і, у прыватнасьці, дырэктар па збыту Плоткін ігнаруюць патрэбы спажыўца. «Нам нявыгодна гандляваць сэльтэрскай вадой»,—заяўляе Плоткін.

Адзін толькі Менскі ЦРК мае па горадзе 73 адзінкі, якія гандлююць прахладжальнымі напіткамі. У красавіку плян спадзяньня выканан заводам «Беларусь» на 30 проц., у маі—ня больш. Кіёскі, ларкі, якія павінны былі працаваць у дзьве зьмены, працуюць 2-3 гадзіны. На сквэрах, у парку ўвечары нельга купіць шклянку сельтэрскай.

Зусім ня абслугоўваюцца рабочыя ваколіцы, не забясьпечваюцца водамі буфэты на прадпрыемствах.

Завод «Беларусь» зрывае выканань не дагавораў на спадзяньне кіёскаў ня толькі напіткамі, але і лёдам.

Прыкладна, так стаіць справа і ў іншых гарадох БССР. Перад намі тэлеграма з Магілева. Вось яе зьмест: «Зімою нас спадзялі водамі звыш пляну, а летам спышілі». Магілеўскі ЦРК заключыў дагавор з заводам «Пралетары». Адкрыта 13 кіёскаў, але яны ў пераважнай частцы не працуюць.

Прамкаапэрацыя лічыць вытворчасьць газаваных вод дробязью, якой ня варта займацца. У Менску існавала каля 60 саматужных установак па выпуску газаваных вод. Усе гэтыя ўстаноўкі ліквідаваны, а вытворчасьць вод усладзена толькі на адну арцель «Перамога», якая не спраўляецца са сваімі задачамі.

На тэрыторыі с.-г. выстаўкі ёсьць мармалядны завод, які абсталяваны параваручымі катлами. Завод функцыянуе толькі некалькі месяцаў у год. Між тым, яго можна было пераключыць на вытворчасьць квасу і інш. безалькагольных напіткаў для спадзяньня парку адпачынку і культуры і ўсяго Камароўскага раёну.

Неабходна безадкладна арганізаваць продаж вод **з цялежак,** а таксама ва ўсіх кафэ, крамах і г. д.

Трэба дабівацца ня толькі павялічэньня выпуску вод і квасу ў колькасных адносінах, але і паленьшыць якасьць, увёўшы ў продаж рознастайны асартымэнт—клюквенны квас, ліманад і інш.

М.

Н. Цярэнцьцяў

Барацьба імпэрыялістаў за Ціхі акіян

«Праблема Ціхага акіяну стучыцца ў дзьверы цывілізацыі»—заявіў нядаўна ангельскі журналіст сэр **Франк Фокс.** Сутнасьць гэтай праблемы—у канфлікце паміж 3 кіруючымі ціхаакіянскімі дзяржавамі — ПАЗШ, Англіяй і Японіяй, якія сутыкаюцца ў барацьбе за панаваньне над Ціхаакіянскім басэйнам. Канфлікт гэты ў вялікай ступені вывіўся і абвастрыўся ва ўмовах сусьветнага крызісу капіталізму, параджэньнем якога зьяўляюцца і ціперашнія падзеі на Далёкім Усходзе. Канфлікт паміж імпэрыялістамі разгортваецца, зразумела, ва ўзаемадзейнасьці і на аснове кардынальнай супярэчнасьці першай эпохі, супярэчнасьці паміж капіталістычным сьветам і СССР.

Англа-амэрыканскі антаганізм на Ціхім акіяне

«Галоўныя з гэтых (імпэрыялістычных—Н. Ц.) супярэчнасьцяй,—гаварыў тав. **Сталін** у сваім дакладзе на XVI зьезьдзе,—гэта супярэчнасьці паміж ПАЗШ і Англіяй... Галоўная арэна барацьбы — Паўднёвая Амэрыка, Кітай, калёніі і дамініёны старых імпэрыялістычных дзяржаў...».

Англа-амэрыканская барацьба разгортваецца ва ўсіх краінах Ціхаакіянскага басэйну. Барацьба гэта носіць эканамічны характар у брытанскіх дамініёнах і перарастае ў барацьбу палітычную ў Паўднёвай, Цэнтральнай Амэрыцы і на заходнім азіяцкім узьбярэжжы Ціхага акіяну.

Становішча ў дамініёнах характарызуецца наступнымі лічбамі: у 1929 г. доля ПАЗШ у канадзкім імпэрыі складала **68 проц.,** а доля Англіі толькі каля 17 проц., тады як у аўстралійскім імпэрыі доля Англіі была **да 43 проц.,** а доля Амэрыкі узрасла **да 26 проц.** У краінах Ціхаакіянскага ўзьбярэжжа Паўднёвай Амэрыкі—Чылі, Пэру, Эквадары і Калумбіі—доля ПАЗШ у імпартным гандлі ў сярэднім перавышае долю Англіі ў **два-тры разы;** у гэтых-жа краінах назіраецца ў перадваенныя і пасьляваенныя годы выключны рост амэрыканскіх укладаньняў. У Мэксыцы і цэнтральных амэрыканскіх рэспубліках перавага на баку амэрыканскага імпэрыялізму носіць яшчэ больш ярка выяўлены характар.

На Азіяцкім узьбярэжжы Англія ўладае вялізарнай калёніяльнай імпэрыяй і шматлікімі базамі, апіраючыся на якія, яна абараняе тут «статус кво», тады як амэрыканскі капітал энэргічна паступае на ўсім фронце, прасякаючы ў **Малайю, Інданэзію і нават у пэўнай ступені ў Індыю** і працуе над стварэньнем больш выгадных для сябе суадносін сіл.

Нарэшце, у Кітаі, які зьяўляецца важнейшым тэатрам гэтай барацьбы, амэрыканскі капітал жорстка канкуруе з Англіяй у радзе важнейшых галін гандлю. У прыватнасьці, ангельскі і амэрыканскі капітал сутыкаюцца па рынках бавоўны, нафтапрадуктаў, чыгуначнага абсталяваньня, машын. Паміж імі ідзе барацьба і ў адносінах многіх важнейшых аб'ектаў капіталаўкладаньняў (электраўстаноўкі ў Шанхаі).

У палітычных адносінах англа-амэрыканскі антаганізм на Ціхім акіяне адчуваецца з асаблівай сілай іменна за апошнія гады. Няма сумненьня, што гэты антаганізм зьявіўся адным з важнейшых фактараў, якія адкрылі Японіі шлях да захвату Манчжурыі і ўварваньня ва ўласны Кітай.

Англа-японскія супярэчнасьці на Ціхім акіяне

Ня гледзячы на значнае разьвіцьцё англа-амэрыканскага антаганізму, ангельскі імпэрыялізм ня мае магчымасьці ўстанавіць адзіны фронт супроць Амэрыкі з Японіяй, з інтарэсамі якой яго інтарэсы знаходзяцца таксама ў сур'ёзнай супярэчнасьці. Гандлёвае супэрніцтва ва Ўсходняй Азіі найбольш інтэнсыўна іменна паміж Японіяй і Англіяй, канкуруючых адна з аднэй на ўсім фронце. На гэтым фронце ангельскі капітал адступае перад націскам японскага. Становішча як нельга лепш ілюструецца лічбамі, якія адносяцца да тэкстыльнага рынку. У кітайскім імпэрыі бавоўняна-папяровых тканін доля ўдзелу Англіі зьнізілася з 1913 па 1929 год **з 56 да 22 проц.,** тады як доля Японіі падвялася **з 18 да 67 проц.** У імпэрыі бавоўняна-папяровых тканін праз Ганконг доля Англіі за пэрыяд з 24 па 30 год **зьнізілася з 56 да 13 проц., а доля Японіі павысілася з 33 да 66 проц.**

Роўным чынам параўнаўчыя даныя за трэці квартал трох апошніх год аб увозе бавоўняна-папяровых тканін у Малайю і Брытанскую Індыю падаюць невясёлы для Англіі малюнак. У Малаі **зьніжэньне** ангельскага ўвозу склала **82 проц.,** тады як японскі ўвоз **узрос на 18 проц.,** нарэшце, увоз японскіх тканін у Індыю, які яшчэ ў 1925 годзе быў **у 6 раз меншы ангельскага,** за 9 месяцаў 1931 г. ужо **амаль стаў роўным з апошнім.** Становішча ў галіне гандлю некалькі палепшылася для Англіі толькі ў самыя апошнія месяцы ў сувязі з адмаўленьнем ад залатога стандарту, а галоўнае, у рэзультаце анты-японскага байкоту ў Кітаі і на некаторых іншых усходніх рынках.

Такая-ж жорсткая канкурэнцыя існуе і ў галіне суднаходзтва. Нарэшце, у Кітаі і на Малайскім архіпелагу Японія і Англія зьяўляюцца галоўнымі канкурэнтамі ў сфэры капіталаўкладаньняў: навейшыя крыніцы вылічваюць суму ўкладаньняў гэтых дзьвёх краін у Кітаі аднолькавай лічбай—1.250 млн. амэрыканскіх даляраў.

Японія, прышпоўшая пазьней за ўсіх да падзелу калёній, усёй злучнасьцю сваіх эканамічных і палітычных умоў прызначана на ролю парушальніка складзенага ў Заходняй частцы Ціхага акіяну тэрытарыяльнага «статус кво», на варце якога стаіць Англія. Няма нічога дзіўнага, што цытаваны вышэй ангельскі аўтар сэр Франк Фокс, абмяркоўваючы праблему «прывядзеньня ў парадак ціхаакіянскай анархіі» (г. зн. барацьбы з кітайскай рэвалюцыяй), прыходзіць да вываду, што японскае панаваньне ў Кітаі «было-б катастрофай для ўсяго сьвету». Праграма японскай калёніяльнай экспансіі ў канчатковым выніку можа быць ажыцьцёўлёна толькі за кошт англійскага імпэрыялізму.

Адсюль выцякае, што новы англа-японскі саюз немысьлімы. У тым-жа і справа, аднак, што англа-японскія супярэчнасьці разьвіваюцца ў рамках англа-амэрыканскага антаганізму і ва ўмовах барацьбы дзьвёх сыстэм—барацьбы за захаваньне панаваньня імпэрыялізму на Ўсходзе, барацьбы імпэрыялістаў супроць СССР. Страх ангельскага імпэрыялізму перад кітайскай рэвалюцыяй, якая пагражае Англіі з яе буйнейшымі ў сьвеце калёніямі, і нянавісьць да савецкай краіны штурхаюць яго хаця-б да часовага зближэньня з Японіяй. Аслабеўшая Англія, ня гледзячы на ўсю вострасьць англа-японскіх супярэчнасьцяй, імкнецца выкарыстаць японскі імпэрыялізм у ролі міжнароднага жандара, і зараз зьяўляецца застрэльшчыкам намаганьняў, накіраваных на пераключэньне японскай інтэрвэнцыі ў Кітаі ў інтэрвэнцыю супроць СССР.

Япона-амэрыканскі канфлікт

Япона-амэрыканскія супярэчнасьці ў Ціхім акіяне набылі за апошнія гады вялізарную актуальнасьць і вострасьць.

Японскі імпэрыялізм імкнецца шляхам захвату Манчжурыі і атрыманьня львінай долі пры падзеле Кітаю—аўладаць пляндармамі, апіраючыся на якія ён нямінуча будзе разьвіваць далейшае наступленьне з мэтай падпарадкаваньня свайму панаваньню ўсёй Усходняй Азіі і ўсяго Ціхага акіяну. Шляхі і мэты гэтай палітыкі былі ў 1927 г. вельмі адкрыта паданы ў вядомым мэмарандуме барона Танакі—тагачаснага прэм'ера і правадыра партыі Сейюкай.

Але паўночна-амэрыканскі імпэрыялізм ідзе да тэй-жа мэты. Усё апошнае дзесяцігодзьдзе ён вядзе арганізаванае і агрэсыўнае контр-наступленьне супроць японскага імпэрыялізму з мэтай устанаўленьня свайго ўласнага манапольнага панаваньня. Выйшаўшы на арэну калёніяльнага захвату пазьней другіх дзяржаў, амэрыканскі імпэрыялізм ня змог своячасова забясьпечыць сябе належнымі «базамі і сфэрамі ўплыву» на азіяцкім кантынэнце. Гэта акалічнасьць прадвызначыла ў свой час, яшчэ на рубяжы двух вякоў, яго адмоўныя адносіны да палітыкі «ўгрызаньня ў Кітай» эўрапэйскіх дзяржаў і Японіі. Пэрспэктыва падзелу Кітаю пад главенствам Японіі або на аснове зговару паміж Японіяй і Англіяй, вельмі нянрыемлема для Амэрыкі ў даны момант, калі яна больш рашуча, чым калі-б там ні было імкнецца да ўкараненьня ў Кітай і да пераўтварэньня ўсёй гэтай вялізарнай краіны ў амэрыканскі запаведнік. Адсюль настойлівае падтрыманьне амэрыканскім імпэрыялізмам славутай дактрыны «адкрытых дзьвярэй», якая была высунута Амэрыкай у якасьці бар'еру супроць наступленьня ў Кітаі царскай Расіі і Японіі і якая з часам выявіла сваю яркую наступальную, маналапалістычную і агрэсыўную сутнасьць.

Япона-амэрыканскі канфлікт разьвіваецца на працягу ўсіх пасьляваенных год. Вашынгтонская канфэрэнцыя 1921-22 г., на якой Амэрыцы ўдалося пры дапамозе брытанскіх дамініёнаў забясьпечыць часова супраўніцтва з Англіяй і прымусіць Японію да сур'ёзных уступак (дагавор дзевяці дзяржаў, уход з Шаньдуня, адмаўленьне ад некаторых патрабаваньняў у адносінах Манчжурыі) у абмен на морскую згоду, якая абмяжоўвала разбураючае для Японіі супэрніцтва ў будаўніцтве дарагіх відаў морскіх суднаў, а, галоўнае, забараніла другім дзяржавам будаваць і ўмацоўваць морскія базы ў заходняй частцы Ціхага акіяну,—азначала толькі каротка-тэрміновае перамір'е. На базе вашынгтонскай згоды мела месца далейшае абвастрэньне і паглыбленьне імпэрыялістычных супярэчнасьцяй наогул і япона-амэрыканскага канфлікту ў Ціхім акіяне, у прыватнасьці. Адлюстраваньнем гэтага канфлікту зьявілася, між іншым, абвастрэньне япона-кітайскіх адносін у Манчжурыі; Амэрыка падтрымлівала і натхняла кітайскія ўлады Манчжурыі ў іх процідзейнасьці далейшаму японскаму ўварваньню.

Захват Манчжурыі, які забясьпечвае Японіі новы важны пляцдарм на кантынэнце і вялізарнае павялічэньне яе матар'яльных рэсурсаў, сам па сабе азначае вялізарнае ўзмацненьне японскага імпэрыялізму і карэнным чынам зьмяняе ў навыгадны для Амэрыкі бок падыходзячую рана ці позна вайну за панаваньне над Ціхім акіянам.

Але захват Манчжурыі толькі ступень да новых заваяваньняў японскага імпэрыялізму. За ім, як вядома, пасьледваў ужо захват важнейшага ў палітычных, эканамічных і стратэгічных адносінах Шанхайскага раёну.

Прытым ход падзей паказаў, што **Японія бярэ просты курс на падзел Кітаю, або ва ўсякім выпадку на захват новых пляцдармаў, што забясьпечваюць гэты падзел у бліжэйшым будучым.** Зразумела, што Амэрыка была застанецца зусім непрымірымай у адносінах да гэтых японскіх імкненьняў, ажыцьцяўленьне якіх азначала-б поўнае крушэньне ўсіх плянаў амэрыканскай экспансіі на Далёкім Усходзе. Калі амэрыканскі імпэрыялізм да пары да часу вымушан займаць чакальную стрыманую пазыцыю і абмяжоўвацца слоўнымі заявамі, дык гэта тлумачыцца толькі, з аднаго боку, ізаляцыяй ПАЗШ перад тварам фактычнага падтрыманьня Японіі ангельскім і асабліва францускім імпэрыялізмам, а, з другога боку, тэй акалічнасьцю, што барацьба паміж імпэрыялістамі за Ціхі акіян пераплятаецца з барацьбой імпэрыялізму ў цэлым супроць калёніяльнай рэвалюцыі і супроць Савецкага саюзу і спалучаецца з вялізарным далейшым абвастрэньнем асноўнай супярэчнасьці нашай эпохі—супярэчнасьці паміж капіталістычным сьветам і СССР.

Барацьба за Ціхі акіян і барацьба дзьвёх сыстэм

Ціхі акіян заўсёды быў важнейшым тэатрам разьвіцьця гэтай супярэчнасьці, якая адчувалася тут з асаблівай сілай паваг у пэрыяд адноснага мірнага існаваньня двух сыстэм. Іменна таму, што калёніяльны і калёніяльны сьвет зьяўляецца ахілесавой пятой імпэрыялізму, апошні нічога так не баіцца, як змычкі і супрацоўніцтва паміж працоўнымі Савецкага саюзу і рабочымі і сялянамі прыгнечаных калёніяльных і паўкалёніяльных краін, што змагаюцца за сваё вызваленьне. Нідзе таму антысавецкія імкненьні сусьветнай буржуазіі не выдаўляліся ў больш агаленай форме, чым на Далёкім Усходзе. Нідзе яны не знаходзілі сабе адлюстраваньня ў такіх адкрытых і цынічных актах антысавецкага бандытызму, як тут (успомнім хоць-бы налёт на паўпрэдзтва ў Кітаі, захват КУЧ і г. д.).

Няма ніякага сумненьня, што наступленьне японскага імпэрыялізму на Далёкім Усходзе—прынамсі ў тых формах, якія яно прыняло, было магчыма толькі ў атмасфэры інтэнсыўнай падрыхтоўкі новых антысавецкіх авантур ва ўсім капіталістычным сьвеце. Няма таксама сумненьня, што пэўныя колы японскай буржуазіі, памешчыкаў і ваеншчыны непасрэдна зьвязваюць захват Манчжурыі з пэрспэктывай ажыцьцяўленьня сваіх старых захватніцкіх плянаў у адносінах КУЧ, якая належыць Савецкаму саюзу і знаходзіцца ў сумесным савецка-кітайскім кіраўніцтве, і ў адносінах да Савецкага Далёкага Ўсходу, так багатага рыбаю, нафтай, лесам і інш.

Напомнім, што японскі ўрад адмовіўся заключыць прапанаваны СССР пакт аб непадпадзе; напомнім таксама вельмі яркія японскія дакуманты, якія сьведчаць аб паяўнасьці пэўных пляпаў антысавецкай інтэрвэнцыі, вытрымкі з якіх (дакумантаў) былі ў свой час апублікаваны ў савецкім друку. З другога боку ня менш відавочна, што **палітыка Англіі і Францыі якія падтрымліваюць наступленьне японскага імпэрыялізму, прадыктавана ў першую чаргу іменна антысавецкімі імкненьнямі ангельскай і францускай рэакцыі, што гэта палітыка ўвязана з палітыкай варожага акружэньня СССР і мае ў сваёй аснове разьлік на выкарыстаньне японскага імпэрыялізму, як жандара для задушэньня вялікай кітайскай рэвалюцыі і, калі акалічнасьць дазволіць, дык і для нападу на СССР.**

Гэтыя разьлікі нячужыя, само сабой зразумела, і амэрыканскай рэакцыі, непрымірыма варожай і агрэсыўнай у адносінах да СССР, нікольні ня ў меншай ступені, чым яе эўрапэйскія субраты.

ПОУНАСЬЦЮ ВЫКАРЫСТАЦЬ МЯСЦОВЫЯ РЭСУРСЫ

для пашырэньня вырабу тавараў шырокага спажываньня

Рамонтныя майстэрні прамкаапэрацыі —бліжэй да заводаў, саўгасаў, калгасаў

Прамкаапэрацыя БССР за апошні час разгарнула некаторую работу па арганізацыі рамонту абутку і вопраткі. На рэспубліцы налічваецца 308 майстэрань на рамонце абутку і 169 майстэрань і цэхаў па заказе і рамонце вопраткі. У гэтых майстэрнях прамысловай каапэрацыі занята каля 6.000 чал.

Аднак, **якасьць** работы многіх арцеляй, якасьць абслугоўваньня спажыўца далёка нездавальняючая.

У мінулым годзе плян па рамонце абутку выкананы толькі на 81 проц., а па вопратцы — на 45 проц. Сетка рамонтных майстэрань асабліва па вопратцы невыстарчальная для абслугоўваньня патрэб рабочых, калгасьнікаў і іншых працоўных. Наглядаюцца факты недапушчальных адносін да заказчыка. У некаторых майстэрнях маюць месца бесгаспадарчасьць, абязьлічка, прапоўная дысцыпліна не на вышыні.

Многія арцелі вельмі марудна ажыцьцяўляюць дырэктыву ўраду аб пераключэньні работы на прыёмку індывідуальных заказаў. Толькі паасобныя арцелі, як «Уцільжыркосьць» і імя Крупскай паказваюць сапраўдныя ўзоры барацьбы за паляпшэньне абслугоўваньня спажыўца і вышукваньне дадатковых недэфіцытных сырцовых рэсурсаў для пашырэньня вырабу тавараў шырокага спажываньня.

Эканомсавет БССР вызначыў рад мерапрыемстваў па паляпшэньні работы сыстэмы прамкаапэрацыі, галоўным чынам, па лініі разгортваньня сеткі рамонтных майстэрань, адкрыцьця новых майстэрань і г. д.

Эканомсавет абавязаў Белпрамсаюз, апрача пашырэньня сеткі рамонтных майстэрань, адкрыць прыёмна-здатачныя пункты па рамонце. **Новыя рамонтныя майстэрні будуць адкрыты пры найбольш буйных прамысловых прадпрыемствах, саўгасах, калгасах.**

Вызначаны жорсткія тэрміны знаходжаньня ў рамонце абутку і вопраткі з тым, каб яны **не перавышалі 10 дзён для капітальнага рамонту і 3-5 дзён для дробнага і сярэдняга рамонту.**

Заказныя і рамонтныя майстэрні пры арцелях у гэтым-жа годзе павінны быць пераведзены на гаспадарчы разрахунак.

Катэгарычна забаронена ў рамонтных майстэрнях пашыўка новага абутку з матар'ялаў, якія вызначаны ў плянавым парадку для рамонту абутку.

Белпрамсаюз абавязан у бліжэйшы-ж час адкрыць у буйных прамысловых цэнтрах самастойныя майстэрні для пашыўкі новага адзеньня.

Пры рамонтных майстэрнях і ў магазынах раздробнага гандлю прамкаапэрацыі **арганізуецца скупка старога абутку і адзеньня для пераробкі і абмену на новыя.** Для гэтай мэты прамкаапэрацыяй вылучаецца спэцыяльны капітынгент тканін для стварэньня абменных фондаў.

Эканомсавет забараніў перакідваньне рабочай сілы з прадпрыемстваў прамкаапэрацыі, якія рамантуюць і шыюць новы абутак і вопратку.

Раўнаньне на арцелі імя Крупскай і „Уцільжыркосьць“

Менскія арцелі — панчошна-трыкатажная **імя Крупскай** і не выпрацоўцы мыла — **«Уцільжыркосьць»** па-бальшавіцку рэалізуюць дырэктывы партыі і ўраду аб пашырэньні вытворчасьці тавараў шырокага спажываньня і паляпшэньні абслугоўваньня спажыўца.

У арцелі імя Крупскай арганізаваны спэцыяльныя рамонтныя брыгады з 40 чал., якія перарабляюць адходы вытворчасьці, старыя панчохі. Дзьве брыгады выпрацоўваюць з адходаў дзяржпрамысловасьці розныя панчошна - трыкатажныя вырабы. Брак даведзен да нуля, сабекошт прадукцыі зьніжан.

Да гэтага часу адходы былі раскіданы па двары, а ў лепшым выпадку прадаваліся іншым арганізацыям за бесцэнь. Цяпер з гэтых адходаў арцель выпрацоўвае дзіцячыя шапачкі, сьвітрыкі і г. д. У выніку выкарыстаньня адходаў атрымана эканомія на працягу кварталу 8.000 руб. У красавіку арцель выканала прамфінплян на 125 проц.

На меншых посьпехаў дабілася арцель «Уцільжыркосьць». У 1931 г. арцелью выпушчана каля 370 тон мыла. У 1932 годзе вытворчая праграма павялічана да 500 тон гаспадарчага мыла, 500 тон пасты і 300 кгр. парашку. У першым квартале прамфінплян выканан на 106 проц.

Гэтых посьпехаў арцель дасягнула ў выніку правядзеньня рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў і пераключэньня ўсёй работы па выпуску мыла на мясцовым недэфіцытным сырцу. Старшыня арцелі тав. Цэнцыпэр, ён-жа тэхнарук гэтай арцелі, вынайшоў спосаб выпрацоўкі мыла з пяску і гліны. Пераапрацоўка сырцу робіцца на салатопках арцелі.

Трэба, каб Белпрамсаюз пашырыў вопыт работы гэтай арцелі і ў далейшым разгортваў работу па выпуску тавараў шырокага спажываньня.

Ударная брыгада:
Гольдшмідт, Рак, Пляц, Песьман, Кецлак, Літкіна, Іцковіч, Цэнцыпэр, Жухавіцкі.

Пашырыць выраб і рамонт мэблі

Першы квартал 1932 году менская арцель «**Дрэваапрацоўшчык**» скончыла з недавыкананьнем прамфінпляну па 17 проц. У красавіку матрацны цэх рэалізаваў вытворчае заданьне на 97,8 проц., цэх на вырабе мэблі — на 86,5 проц., такарны цэх — на 55 проц., пэнальны — на 32 проц.

Праўленьне арцелі да гэтага часу не перабудавала сваёй работы на аснове 6 умоў тав. Сталіна. Асноўныя цэхі, якія выпускаюць прадукцыю шырокага спажываньня — мэблевы, матрацны — не пераведзены на гаспадарчы разрахунак. Цэх, які вырабляе крэслы, зьменшыў выпуск крэслаў з 16 тузін да 4 па віне кіраўніцтва арцелі і дрэваапрацоўчага аб'яднаньня Белпрамсаюзу.

Праўленьне да гэтага часу не адкрыла майстэрань для прыняцьця індывідуальных заказаў. Тое-ж самае і з рамонтнымі майстэрнямі. Паводле прамфінпляну, на ўвесь 1932 год прадугледжваецца рамонт мэблі толькі на 15.000 руб. У красавіку адрамантавана на 283 руб. Тлумачыцца гэта тым, што дагэтуль па горадзе не адкрыта ніводнага аддзяленьня, якое-б прымала заказы на рамонт мэблі. Выручныя для гэтай мэты тры рабочыя, зразумела, ня могуць задаволіць патрэб насельніцтва ў рамонце мэблі.

Аб'яднаньне дрэваапрацоўчай прамысловасьці Белпрамсаюзу ня толькі не дапамагае арцелі, але тармозіць работу. Адзінае рамонтнае аддзяленьне не забясьпечана фарнітурай. Не хапае спружынак, саломы, цьвікоў, клею.

Ударная брыгада:
Ноткін, Розін, Спэктар, Гурзвіч, Вігдорчык, Шнітман.

Аб правядзеньні праполачнай і ўборачнай кампаній

Пастанова Калегіі Наркамзему і праўленьня Калгасцэнтру БССР

Улічваючы недахопы мінулага году ў галіне арганізацыі і правядзеньня ўборачнай і праполачнай кампаній, якія заключаліся, галоўным чынам, у невыстарчальным догляде за пасевамі, несваячасовай уборцы, невыстарчальнай увазе да захаваньня ўраджаю, асабліва бульбы, у выніку чаго пасьля ўборкі выявіліся значныя страты, якія ў некаторых калгасах выклікалі трудасьці зімой і вясной гэтага году ў справе забесьпячэньня насеньнем і фуражом, і падкрэсьліваючы, што цэнтральнай задачай праполачнай і ўборачнай кампаніі 1932 г. зьяўляецца рашучае павышэньне ўраджайнасьці і зьніжэньне страт, калегія НКЗ і праўленьне Калгасцэнтру пастанаўляюць:

Паставіць перад усімі раёна, калгасаводамі, МТС, калгасамі і брыгадамі наступныя задачы:

1. Мабілізаваць шырокія масы калгасьнікаў і калгасьніц на барацьбу са стратамі ў сельскай гаспадарцы і на ажыцьцяўленьне аграмерапрыемстваў.

2. Стварыць моцную кармовую базу шляхам абавязковага і свячасовага правядзеньня 2-х укосаў сенажацяй і поўнай уборкі кармовых культур.

3. Правільна арганізаваць працу і расставіць рабочую сілу ўнутры брыгады, поўнасьцю скарыстаць на аснове выдзелышчыны працоўную сілу, праполачныя і ўборачныя машыны.

4. Райза, калгасаюзам, МТС і праўленьням калгасаў растлумачыць кожнаму брыгадзіру і калгасьніку, што ад ступені і якасьці выкананьня гэтых задач залежыць таварнасьць сацыялістычнай гаспадаркі, велічыня ўраджаю на ацэнку брыгады і тым самым велічыня аплаты працадня ў брыгадзе і разьмер даходу кожнага калгасьніка.

У галіне аратэхнікі і аховы пасеваў

1. Арганізаваць барацьбу са сьмяцьцёвымі травамі шляхам:

а) правядзеньня поліва ільнаніцы, бабовых і гатункових пасеваў ад пустазельля;

б) правядзеньня двухразовага поліва ільну і па менш 3-разовага поліва коранаплодаў і гародаў;

2. Свячасова правесьці мерапрыемствы па барацьбе са шкоднікамі і хваробамі с.-г. расьлін, у прыватнасьці, па садох на плошчы ня менш 5.500 га, гародах — 1.500, тэхкультурах — 7.000 га, коранаплодах — 6.500 га, бульбе — 10.500 га, абавязаўшы АРСВІН завезьці для гэтай мэты апаратуру і атруту.

3. Правесьці свячасовае баранаваньне і двухразовую абсыпку бульбы.

4. Правесьці узорваньне ўсяго чыстага папару, вываазку гапны, пюю, фасфарытнай мукі ў памер да 15 чэрвеня і ня менш двухразовага баранаваньня пасьля ўзорваньня.

5. Адказваць за свячасовае правядзеньне агратэхнічных мерапрыемстваў на вытворчым вучастку брыгады ўскладзьці на брыгадзіра.

У галіне ўборкі

1. Свячасова распачаць уборку. Уборку траў праводзіць у пачатку квятненьня, збожжавых — у пэрыяд васковай сьпеласьці, цераблеьне ільну — у пэрыяд жоўтай сьпеласьці, уборку бульбы — пры зацьвярдзеньні кажуры.

2. Устанавіць наступны працяг і тэрміны скончэньня ўборкі розных культур: уборку сенажацяй першага ўкосу — за 20 дзён, другога ўкосу — 15 дзён, сухадольных і лясных сенажацяй — 20, канюшыны на корм першага ўкосу — 12, другога ўкосу — 15, ільну — 15, капусты — 15, азімых — 10, яравых збожжавых — 15, бульбы — 20 дзён.

Тэрміны скончэньня ўборкі ўстанавіць наступныя:

Уборка сенажацяй першага ўкосу — ад 5 да 10 ліпеня, другога ўкосу — ад 20 да 25 верасьня, сухадольных і лясных сенажацяй — да 20-VII — паўднёвая зона, да 25-VII — цэнтральная, да 30-VII — паўночная.

Уборка канюшыны першага ўкосу — 25-30-VI, другога ўкосу — 30-VIII — 5-IX, ільну — да 20-VIII — паўднёвая зона, 25-VIII — цэнтральная, 30-VIII — паўночная зона, уборка азімых — 10—15-VIII, яравых збожжавых—да 20-VIII — паўднёвая, 25-VIII — цэнтральная, 30-VIII — паўночная зоны; бульбы — да 1—5 кастрычніка.

3. Калгасаюзам, райза, МТС устанавіць сыстэматычную праверку выкананьня гэтых тэрмінаў уборкі.

4. У мэтах найбольш поўнага скарыстаньня с.-г. машын, устанавіць наступную нагрузку на ўборачную машыну: для сенажасаркі—5 га ў дзень, конных грабель — 8 га, на жнэйку-самаскідку — 5 га, на ільнацераблку з спопавязальным апаратам — 1,2 га ў дзень, па ільнацераблку без спопавязальнага апарату — 1,2 га, машыну Гільштэйна па абчосе галовак — 60 коп, малатарню Эддэ — 40 коп, бульбакапалку — 1 га, радковую сявярку пры сяўбе азімых — 4 га ў дзень.

5. Райза, калгасаюзам, дырэктарам МТС і праўленьням калгасаў азраз-жа прыступіць да падрыхтоўкі машын на ўборачную кампанію, забясьпечыўшы іх тарачным, запаснымі часткамі і прымацаваўшы да работы на іх пастаянных людзей. Арганізаваць шырокую міжкалгасную ўзаемадапамогу ўборачнымі і апрацоўчымі машынамі.

6. Уборку ўсіх культур арганізаваць канвэйэрным спосабам з тым, каб сьледам за жнівом, цераблеьнем, касьбой, або косткай бульбы праводзіць сушку, звозку, скірдаваньне, апрацоўку і хаваньне ўраджаю, не дапускаючы, як правіла, пакіданьня ўраджаю на полі ў сялах больш 2-3 дзён.

7. Абавязаць Белсельснаб і Трактарацэнтр завезьці да ўборачнай кампаніі спэцыяльных уборачных машын на 3 млн. руб., у тым ліку па сенаўборцы—3,5 тыс. штук па суму 470 тыс. руб., жатак і снопавязалак — 2 тыс. штук на 400 тыс. руб., бульбакапалак — 2 тыс. штук на 470 тыс. руб.

Арганізацыя працы ў часе праполачна-ўборачнай кампаніі

1. Усім праўленьням калгасаў не пазьней 10-га чэрвеня скласьці па кожнай брыгадзе рабочы плян ўборачна-праполачнай кампаніі, з улікам арганізацыі плянавага адыходніцтва.

2. З прычыны таго, што ў некаторых калгасах брыгады або зусім не арганізаваны, або арганізаваны няправільна (ня вызначаны вучасткі, арганізаваны сэзонныя брыгады замест пастаянных і г. д.) правесьці да пачатку праполачнай кампаніі афарміленьне брыгад у пастаянныя на цэлы год, замацаваўшы за брыгадамі с.-г. машыны, інвэнтар, цягавую сілу.

3. Зьвярнуць асаблівую ўвагу на правільную расстаноўку сіл унутры брыгады. Выходзячы з наяўнасьці рабочай і цяглавай сілы, інвэнтару, аб'ёму і тэрміну работ па кожнай культуры, разьбіць брыгады на групы так, каб усе работы праводзіліся бесьперабойна і былі скончаны па ўстаноўленым тэрміну.

4. Праўленьням калгасаў ускласьці адказнасьць на брыгадзіраў і дапамагчы апошнім арганізаваць пераключэньне брыгад, брыгадных груп і асобных калгасьнікаў з сяўбы на праполку і ўборку, такім чынам, каб ня было прастояў і каб усе ўдзельнікі брыгады былі поўнасьцю [illegible]нуты ў працу.

5. У выпадках немагчымасьці дал[illegible] брыгады, ня гледзячы на ўлічэньне рабочага дня, сваімі сіламі скончыць тую або іншую працу за ўстаноўленыя тэрміны, праўленьне калгасу павінна арганізаваць ёй дапамогу з боку іншых брыгад. Адначасова трэба рашуча змагацца з цякучасьцю ў брыгадах, канчаткова ліквідаваць абязьлічку палявых вытворчых вучастка[illegible].

6. Улік працы і запіс працадзён праводзіць так, каб кожны калгасьнік штодзенна ведаў сваю выпрацоўку на працадзёх. Арганізаваць вывешваньне сьпісаў выпрацаваных працадзён на відных мясцох. Праводзіць штодзенна кароткія нарады ў часе абедзеных перапынкаў, або пасьля скончэньня працы аб ходзе работы ў брыгадзе.

7. Абавязаць усе праўленьні калгасаў і ўсіх брыгадзіраў перад пачаткам праполачных і ўборачных работ яшчэ раз прапрацаваць у брыгадзе нормы выпрацоўкі, устанавіўшы прэмі за лепшае па якасьці і колькасьці выкананьне і перавыкананьне вытворчых заданьняў, адразу пасьля выкананьня тэй або іншай работы па догляде і ўборцы.

8. Арганізаваць шырока сацыялістычнае спаборніцтва паміж калгасамі, брыгадамі, групамі і асобнымі калгасьнікамі на больш хуткае выкананьне работы і на лепшыя якасныя паказальнікі, рэгулярна асьвятляючы ў насьценных газэтах, раённым і цэнтральным друку ход выкананьня ўмоў на спаборніцтве, лепшыя прыклады працы і выкрываючы тых, якія плятуцца ў хвасьце.

9. Для ўцягненьня ўсёй рабочай сілы ў работу на праполцы і ўборцы, прапанаваць райза, калгасаюзам і МТС не пазьней 15 чэрвеня разгарнуць поўнасьцю работу дзіцячых ясьляй, дзіцячых пляцовак, устаноў грамадзкага харчаваньня. Арганізаваць калектыўны падвоз харчоў у поле.

10. У часе праполачнай і ўборачнай кампаніі не павінна быць ніводнага працаздольнага члена калгасу, які-б застаўся нават на адзін дзень без работы.

Стварэньне кармовай базы

1. У мэтах поўнага забесьпячэньня кармамі калгасных таварных фэрм, іншай аграмаджанай жывёлы і жывёлы, якая знаходзіцца ў асабістым карыстаньні калгасьнікаў, абавязаць райза, калгасаюзы, МТС і праўленьні калгасаў зьвярнуць асаблівую ўвагу на правядзеньне мерапрыемстваў па стварэньні кармовай базы.

2. Забясьпечыць поўнасьцю правядзеньне двух укосаў сенажацяй і свячасовую ўборку сеяных траў.

3. Вызначыць плошчу для пакіданьня на насеньне: лубіну, сэрадэлы, вікі палошпанай (аднатыповай) — на 100 проц., бабовых — ня менш 50 проц., вікі звычайнай—ня менш 30 проц., канюшыны чырвонай—ня менш 30 проц. першага ўкосу ў рабках паўночнай зоны і другога ўкосу ў рабках цэнтральнай і паўднёвай зоны і ня менш 50 проц. у насенаводных калгасах. Таксама вызначыць насенныя вучасткі збожжавых, бульбы, гародніны лепшай галушковай якасьці і здаровых ад пашкоджаньняў і больш каштоўныя па ўраджаі для стварэньня насенфонду, выходзячы з 100 проц. засыпкі насенфондаў веснавой сяўбы 1933 г.

4. З прычыны таго, што пэрыяд уборкі сенажацяй зьяўляецца найбольш напружаным, ушчыльніць у гэты пэрыяд максымальна працоўны дзень і шырока арганізаваць дапамогу палявым брыгадам з боку іншых брыгад (жывёлагадоўчых, будаўнічых і г. д.).

5. Праўленьням калгасаў забясьпечыць выкананьне плану сіласаваньня, абавязаўшы будаўнічыя брыгады калгасаў да 10 ліпеня поўнасьцю скончыць рамонт старых і пабудову новых сіласных ям, траншэй і вежаў.

6. Праўленьням калгасаў забясьпечыць уборку сілазных культур і сіласаваньне іх у вызначаны тэрмін: да 1-га жніўня — 15 проц., да 1-га верасьня — 50 проц. і поўнае скончэньне сіласаваньня не пазьней 1-га лістапада.

Улік і хаваньне ўраджаю

1. У мэтах зьнішчэньня страт па перавозцы і хаваньні ўраджаю і для стварэньня магчымасьці правільнага разьмеркаваньня яго, арганізаваць поўны ўлік ураджаю шляхам пробных абмалотаў і шляхам пільнага нагляду пры скірдаваньні, буртоўцы і звозцы ў закрытыя памяшканьні (сьвірны, кладовыя і інш. пасенахавальнікі).

2. Улічваючы значныя страты, якія мелі месца ў мінулым годзе пры перавозцы з поля і захаваньні ўраджаю, абавязаць райза, калгасаюзы, МТС і праўленьні калгасаў правесьці да пачатку ўборкі рамонт, ачыстку і дэзынфэкцыю ўсіх складачных памяшканьняў (гумнаў, сьвірнаў і інш.). Ускласьці ў калгасах адказнасьць за перавозку і хаваньне ўраджаю на кладаўшчыка, або спэцыяліста вылучаных ло[illegible] і арганізаваць [illegible] прыёмачнай ведамасьці [illegible] махор- [illegible] весны абмалоту.

Безадкладна падрыхтаваць да ўборачнай і праполачнай кампаній

1. Праграму і плян правядзеньня праполачнай і ўборачнай кампаній зацьвердзіць. Даручыць сэктару аратэхнікі і с.-г. кампаніі і ліквідаваму сэктару давесьці праграму і плян да калгасаў не пазьней 10 чэрвеня.

2. Прапанаваць усім райза, калгасаюзам і МТС давесьці праграмы і планы ўборачнай і праполачнай кампаній да калгасаў і брыгад, арганізаваўшы шырокую прапрацоўку іх калгасьнікамі.

3. Даручыць райза, калгасаюзам і МТС зараз-жа пасьля скончэньня сяўбы разгарнуць работу курсаў, курсаў-нарад, правесьці канфэрэнцыі для падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі актыву для праполачнай і ўборачнай кампаніі (брыгадзіраў, групаводаў, трактарыстаў, працаўнікоў на прычэпных машынах, рухчотчыкаў, кладаўшчыкоў і інш.).

4. Правесьці перад пачаткам уборачнай кампаніі нарады старшынь калгасаў па пытаньнях разгортваньня і правядзеньня ўборачнай кампаніі.

Больш клясавай пільнасьці

Кулак добра ўявіў сабе, што толькі штодзенная практычная работа па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў у іх арцельнай форме разьвіцьця, правільная арганізацыя працы на аснове стварэньня пастаянных вытворчых брыгад можа забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне праполачнай і ўборачнай кампаній. Кулак будзе імкнуцца арываць праполку і ўборку, з сярэдзіны разбураць калгасы. Бязьлітасна выкарчоўваючы ўсе спробы клясавага ворага, кожны калгасьнік павінен выканаць і перавыканаць як колькасныя, так і асабліва якасныя паказальнікі ў сваёй рабоце і тым самым яшчэ раз нанесьці зьнішчальны ўдар на кулаку і яго прыхільніках.

Народны камісар земляробства БССР РАЧЫЦКІ.
Старшыня праўленьня Калгасцэнтру МІЦЬКОЎ.



МАНТАЖ МЭТАЛЁВЫХ КАНСТРУКЦЫЙ БУДЫНКУ ДЛЯ МАГНІТАГОРСКАГА БЛЮМІНГУ

СУТАЧНАЯ ТОРФАЗДАБЫЧА ЎСЁ ЯШЧЭ НЕ ПЕРАВЫШАЕ 30 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ

Здабыча торфу заводамі Белторфаб'яднаньня

Май 28	Заданьне—7.150 тон Здабыта—2.166 „	Проц. выкан. 30,2
Май 29	Заданьне—7.150 тон Здабыта—1.912 „	Проц. выкан. 26,7

28 мая		29 мая	
„Закрашынскі мох“	—86,6 %	„Закрашынскі мох“	—84,1 %
„1 мая“	—51,6 „	Імя Даўман	—42,7 „
„Свабода“	—49,0 „	„Свабода“	—41,3 „
Імя Даўмана	—44,8 „	„Бальшавік“	—35,7 „
„Бальшавік“	—33,7 „	„Шлях сацыялізму“	—32'5 „
„Чырвоная Беларусь“	—32,6 „	„Чырвоная Беларусь“	—30,2 „
„Шлях сацыялізму“	—31,9 „	„Асінторф“	—25,0 „
„Смалявічы“	—22,2 „	„Чырвоны сьцяг“	— 6,5 „
„Асінторф“	—18,7 „	„Смалявічы“	— —
„Чырвоны сьцяг“	—18,4 „	„1 мая“	— —

УВАГА: Заводы „Смалявічы“ і „1 мая“ 29 мая не працавалі з прычыны выходнага дня.

Не хапае 100 тарфяньнікаў

На торфах заводу **«Чырвоная Беларусь»** зараз працуе 6 брыгад на трох машынах. Спаборнічаючы паміж сабою, брыгады змагаюцца за здабычу 40 тыс. цаглін за зьмену. Брыгада тав. **Новікава** ўжо дасягнула 36 тыс. цаглін, а брыгада тав. **Царава**—37.600 цаглін.

Аднак, выкананьне агульна-заводзкай праграмы вельмі ніякае. На 27 мая каляндарны плян выканан толькі на 26,4 проц. Ад пачатку торфсэзону завод недавыпрацаваў больш 5.000 тон торфу.

Такое адставаньне тлумачыцца, галоўным чынам, тым, што торфаздабыча не забясьпечана выстарчальнай колькасьцю рабочай сілы. Адных толькі тарфянікаў не хапае 100 чал. Акрамя гэтага, адчуваецца значны недахват тарфяніц, з прычыны чаго тармозіцца сушка торфу. «Зьвязда» пісала ўжо аб тым, што трыкутнік заводу ў часе падрыхтоўкі да сэзону зусім не займаўся пытаньнем арганізаванага набору рабочай сілы. Зараз на заводзе таксама ў гэтым напрамку нічога ня робіцца. Спадзяваньне на самацёк—асноўная прычына недахвату рабочых.

Грабоўскі.

„Новая Беларусь“ ня выконвае свайго заданьня

За апошні час на заводзе **«Новая Беларусь»** (Бабруйскі раён) крывая торфаздабычы пачала паступова ўзьдымацца. Калі ў першай палове мая выпрацоўка дзённага заданьня складала ня больш 30%, дык зараз яна даведзена да 75 проц. Па тэмпах торфаздабычы завод **«Новая Беларусь»** ідзе ўперадзе ўсіх торфазаводаў мясцовай дзяржпрамысловасьці.

Паасобныя брыгады паказваюць узоры сапраўднай ударнай работы. Так, брыгада тав. **Міранёнкі** дзённае заданьне за 26 мая выканала на 110 проц., брыгада тав. **Пінчуковай Насьці**—на 109 проц., брыгады т. т. **Суднікава і Сталярова**—на 103 проц. кожная.

Якія-ж прычыны таму, што завод усё-ж такі ня выконвае поўнасьцю свайго сутачнага заданьня? Перш за ўсё—гэта нездавальняючая работа торфаробкопу, які зусім не клапоціцца аб паляпшэньні рабочага снабжэньня. Сьвінаадкормачны пункт знаходзіцца ў вельмі дрэнным стаўленьні. У адкорме сьвіней існуе абязьлічка. **Аб арганізацыі трусатніка праўленьне торфабкопу зусім ня думае. Самазагатоўкі таксама не праводзяцца**

Тарфком заводу нездавальняюча разгарнуў прафсаюзную работу сярод тарфянікаў і тарфяніц. Уліку і прэміраваньня лепшых ударнікаў не праводзіцца. **Зусім адсутнічае работа па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці тарфяніц, сярод якіх больш паловы няпісьменных.**

Мала дапамагае ў паладжаньні работы камсамольскай ячэйкі заводу райком камсамолу. Ня гледзячы на тое, што большасьць рабочых камсамольскага ўзросту, работа сярод моладзі не праводзіцца.

Г. М. Т. Г.

Ул. Мяжэвіч, З. Паваротны

Спэктакль рэвалюцыйнай зарадкі

(„Пляцдарм“ у БДТ-1. Пастаноўка Цітвінава)

З рэвальвэра, купленага за гроны чха-славацкага дыктатара Бэнэша, забіт Думэр — прэзыдэнт францускай буржуазнай рэспублікі. Белагвардзейскае атрэп'е, гнілая пацяруха з парыскіх, берлінскіх, варшаўскіх, прасскіх прытонаў і розных фашысцкіх «зялёных» саюзаў навяла руку контррэвалюцыянэра, заядлага ворага савецкай улады — Паўла Гаргулава, паклоньніка Мусаліні і «правадыра» рускіх фашыстаў іменна ў гэту мішэнь.

Францускі імпэрыялізм страціў аднаго са сваіх выдатных прадстаўнікоў і палітычных дзеячоў. Гэты праваакатарскі выпадак пастаралася, як найменш, выкарыстаць Польшча, каб зрабіць лішні паклон «маман Францыі», выказаць глыбокую павагу і запэўніць у сваёй вернай службе па мяжы абароны заходняй, з дазволу сказаць, «цывілізацыі». Ужо 8 мая адна з найбольш «тэмпэрамэнтных» газэт польскага імпэрыялізму «**Кур'ер Поранны**» пісала: **«З прычыны становішча, якое займае Польшча на карце сьвету, яна павінна адыграць вялікую ролю...».** І тут-жа «Кур'ер Поранны» робіць асабліва мяккі і лісьлівы рэвэрансік «ідэалёгічнай» і «пазыковай» маман:

«МЫ СЁНЬНЯ ПОБАЧ З ФРАНЦЫЯЙ,—распаяваецца «Кур'ер»,—**МЫ З ВАМІ, І БУДЗЕМ З ВАМІ ЗАЎСЁДЫ, КАЛІ ТОЛЬКІ ВАМ ГЭТА БУДЗЕ ПАТРЭБНА».**

Фашысцкая Польшча «з прычыны становішча, якое яна займае на карце сьвету», зьяўляецца першым зьвяном, фарпостам капіталістычнага Захаду ў барацьбе супроць краіны Саветаў. Гэта — **пляцдарм** усіх заходніх імпэрыялістычных сіл у падрыхтоўцы да вайны супроць СССР. Сюды працягнуты засакрэчаныя ніткі ад генштабаў вялікіх краін і лімітрофаў заходняга імпэрыялізму. У польскую армію — «мільён бравых жолнежаў» — укладзен не адзін мільён франкаў, фунтаў стэрлінгаў і іншых грашовых катэгорый. Побач з Пілсудзкім працуюць францускія генштабісты. Фашысцкая Польшча «сёньня побач з Францыяй» і яна хоча як найпаўней апраўдаць давер'е і падзеі свайго гаспадара ў заўтрашнім крыжовым паходзе на бальшавікоў. Падрыхтоўка да гэтага паходу з асаблівай сілай разгортваецца ў акупаваных і прыдуманых Польшчай Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, як па тэрыторыі, што непасрэдна **прылягае** да Саветаў.

За апошнія гады польскі імпэрыялізм удасканаліў (і значна пайшоў далей) усе мэтады дзікіх распраў і экзэкуцый. Горшыя часы сярэднявяковай інквізыцыі і рускага цара — Мікалая Палкіна — мізарнеюць перад тым, што творыцца ў акупаваных ЗУ і ЗБ. На пляцдарме створана складанейшая машына праваакатарства і шпіёнства, дзікіх экзэкуцый і карных экспэдыцый, гвалтоўнай палёнізацыі і цынічнага пацыфізму.

Польшча — турма народаў. Гэтым пачынаецца п'еса украінскага драматурга Ірчана **«Пляцдарм»**, пастаўленая БДТ-1, і гэта першая сымбалічная сцэна спэктаклю з высокімі тэрэмнымі кратамі і замучанымі людзьмі з усёй сілай і пераконанасьцю паказвае сапраўдны твар Польшчы, даводзіць яго да гледача.

Па творчым шляху да «Пляцдарму» БДТ-1 прышоў з двума сур'ёзнымі зрывамі. **«Справа гонару»** і **«Шляхі-дарогі»** былі пастаноўкамі ня руху наперад, а значнага **адступленьня** ў параўнаньні з **«Гутаю»** і хоць-бы такім спэктаклем, як **«Міжбур'е»**. У «Справе гонару» і «Шляхі-дарогі» БДТ-1 дапусьціў сур'ёзныя памылкі гола-фармалістычнага і ідэалёгічнага парадку. «Пляцдармам» тэатр у значнай меры перамагае свае зрывы 1931-32 творчага году, якія знаходзяць свае закономерныя карэньні ў мінулых памылках творчага мэтаду БДТ-1.

П'еса Ірчана — пра «ўсходнія крэсы» (ЗУ і ЗБ), гвалтоўна захопленыя Польшчай. Выбар тэатрам зроблен зусім правільна. «Пляцдарм» набывае асаблівае значэньне цяпер, сёньня, калі ў падрыхтоўцы інтэрвэнцыі супроць савецкай краіны праваакацыя зьмяняецца правакацыяй, як на кіноэкране.

Асноўная каштоўнасьць спэктаклю, яго вялікая функцыянальная, мастацка-пераканаўчая сіла ў тым, што ён правільна бярэ стрыжнёвыя пытаньні рэвалюцыйнага нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі, паказвае камуністычную партыю ў дзеяньні, як кіраўніка працоўных мас Заходняй Беларусі, дае здаровую рэвалюцыйную зарадку. Ход спэктаклю ня раз перарываецца шумнымі аплёдысмэнтамі. І гэта зусім невыпадкова. Гэта ўдзячнасьць, што выказваецца нашым працоўным гледачом, заслужана тэатрам упартай і правільнай работай.

У «Пляцдарме» падзвычай ярка і добра паказана польская армія з усімі яе «ўдасканаленымі мэтадамі» вайсковай муштры. Тут, між іншым, трэба ўказаць, што зусім даромна асобныя «завумныя» рэцэнзэнты з «С. Б.» шукаюць у сцэнах паказу польскай арміі грубога натуралізму. Застаюцца незабытнымі і праўдзівымі малюнкі «вайсковай падрыхтоўкі» з паўтарэньнем да поўнага зьнісьленьня таго, што **«бельмі ніткамі гузік ня прышываюць»**, або **«ў шэрагах размаўляць забаронена».**

Вельмі добра і правільна паказаны камсамольцы-салдаты, іх падпольная работа ў армі.

У «Пляцдарме», паводле слоў аднаго з герояў п'есы, «камсамол, як тое пафтавае возера, што загарэлася. Лі на яго ваду, а яно яшчэ больш гарыць».

Спэктакль з вялікай выразнасьцю паказвае, як стыхійныя сялянскія паўстаньні, падпалы маёнткаў і паломка панскіх машын злучаюцца партыяй у маналітную рэвалюцыйную сілу. Сцэна, калі сялянне-стачачнікі ўзьнімаюць кулакі супроць карнай экспэдыцыі, адбівае сапраўднасьць і выяўляе сёньняшні бурны рост рэвалюцыйнага руху ў Польшчы, які адбываецца побач з глыбокім эканамічным крызісам.

Польская хахранка, камісары польскай паліцыі асабліва праславіліся сваёй работай па выяўленьні і зьнішчэньні падпольных камуністычных арганізацый і розных рэвалюцыйных гурткоў. Камісар паліцыі Круча (артыст Зораў) — выдатны напрактыкаваны шпік з «вялікім нюхам». Ён праз шпіка-правакатара Каждана выкрывае ўвесь акруговы камітэт бальшавікоў.

Камуністычным партыям у ЗБ, ЗУ і Польшчы прыходзіцца весьці работу ў надзвычай цяжкіх умовах. «Пляцдарм» паказвае гэтыя складаныя трудасьці работы і барацьбы. Разам з тым спэктакль вучыць распазнаваць шпіка. І калі Дзяніс (актор Рахленка), сакратар партыйнага камітэту ня мог западозрыць у замаскаваным і купленым каапэратары Каждане шпіёна, дык яго распазналі другія камуністы і сёньня хутка распазнаюць дзесяткі іншых кручковых сабак. Правакатар і паліцыя, рускія белабандыты паказаны глыбока і сур'ёзна. Тут паваг дапушчан тэатрам некаторы перагіб палкі. Інтрыга вакол правакатара часамі заслапае асноўны зьмест п'есы, не дае магчымасьці гледачу спыніцца і зразумець галоўнае. Тут дапушчана поўная памылка і яна можа быць лёгка папраўлена. Правакатар Каждан можа быць пазнаны публікай у першых сцэнах. Але гэта прыватны выпадак.

Няправільна было-б залічаць «Пляцдарм» у такія спэктаклі, дзе памылкі зьведзены да мінімуму. У новай пастаноўцы БДТ-1 ёсьць асобныя зрывы, якія адносяцца да пройдзеных этапаў і сёньняшнае іх «адпаўленьне» зусім поцярпіма. Член ЦК тав. Натра (акт. Ржэцкая), партыйны работнік Грышка (засл. артыст рэспублікі Крыловіч), Дзяніс — гэта зусім закончаныя, да канца загартаваныя бальшавікі. Яны злоўлены і пасаджаны ў турму. Іх чакае кара сьмерці і яны спакойна яе чакаюць. Рэвалюцыйнае падполье выхавала і ведае сотні да канца цьвёрдых і рашучых камуністаў. Але ў п'есе гэта стойкасьць часам бывае празьмернай і таму ў канкрэтных выпадках неапраўданай.

Асноўны буйны недахоп п'есы і спэктаклю ў цэлым, недахо

АКУПАНТЫ ЗАКРЫВАЮЦЬ АПОШНІЯ БЕЛАРУСКІЯ ГІМНАЗІІ У ВІЛЬНІ І НАВАГРУДКУ

На Зах. Беларусі не застанецца ні аднэй беларускай школы

ВІЛЬНЯ. Канчатковая ліквідацыя беларускага школьніцтва і адзінай культурна-асьветнай арганізацыі працоўных мас Зах. Беларусі—ТБШ **пастаўлена фашысцкай уладай у парадак дня.** Некалькі дзён таму назад ужо на старонках «Зьвязды» падаваліся паведамленьні буржуазнай польскай прэсы аб разгроме Мірскай акруговай управы ТБШ, разгроме гурткоў гэтага таварыства ў Слонімскім павеце, Вільні, аб закрыцьці настаўніцкай сэмінарыі ў Вільні і намерах фашысцкай улады закрыць апошнія беларускія гімназіі ў **Вільні і Навагрудку.**

У нумары 123 ад 2 чэрвеня **«Кур'ера Віленскага»** (орган віленскіх пілсудчыкаў) зьмешчаны перадавы артыкул—гутарка карэспандэнта гэтай газэты з школьным куратарам Віленскай акругі (дырэктарам народных вучыліщч). У гэтай гутарцы **куратар пацьвердзіў вестні аб закрыцьці ў хуткім часе беларускай гімназіі ў Вільні і Навагрудку.** Прычына закрыцьця—нібы фінансавыя затрудненьні гэтай гімназіі, бо ў іх навучаецца значная частка незаможных сялянскіх дзяцей, «якія схільны да ўспрыйманьня рэвалюцыйных ідэй».

Закрыцьцё апошніх беларускіх гімназій зьяўляецца праўленьнем новай хвалі жорсткага нацыянальнага ўціску з мэтаю хутчэйшай палёнізацыі беларускіх працоўных мас, іх асіміляцыі і фашызацыі. Зразумела, што акупацкая ўлада не магла згадзіцца з тым фактам, што ня гледзячы на праведзеную фашызацыю гэтай гімназіі, сярод вучняў пашыралася нянавісьць да акупантаў-палёнізатараў. Ня гледзячы на актыўную дапамогу акупантам у справе палёнізацыі і фашызацыі беларускай вучнёўскай моладзі з боку беларускіх нацыянал-фашыстаў, **вучні ня так лёгка паддаваліся гэтай палёнізацыі, сярод іх пашыраліся ўплывы рэвалюцыйных арганізацый.**

Сымбаль панаваньня акупантаў на Заходняй Беларусі

Замест закрытых беларускіх гімназій будуць пры польскіх гімназіях адкрыты паралельныя беларускія клясы, у якіх навучаньне будзе адбывацца на польскай мове, а беларуская мова будзе толькі выкладацца як прадмет.

Аб беларускіх сэмінарыях ня можа быць і гутаркі. Больш таго, каб абмежаваць доступ дзецям, нават адзінкам з сялянскай беднаты і сераднякоў у польскія сэмінарыі, апошнія рэарганізуюцца ў так званыя пэдагагічныя ліцэі. Уся сутнасьць гэтай рэарганізацыі заключаецца ў тым, што **ніжэйшыя клясы скасоўваюцца,** а гэта значыць, што наглуха зачыняюцца дзьверы наогул для дзяцей працоўнага сялянства. Такім шляхам польскі фашызм імкнецца падрыхтаваць сабе надзейныя кадры ня толькі на акупаваных Зах. Беларусі і Зах. Украіне, але і наогул ва ўсёй Польшчы, для барацьбы супроць рэвалюцыйнага руху, падрыхтаваць верных служак капіталу і фашысцкай дыктатуры. Ліквідацыя рэштак беларускага школьніцтва па ЗБ набывае зараз асаблівае значэньне ў зьвязку з ліхаманкавай падрыхтоўкай польскага фашызму да інтэрвэнцыі.

У заключэньне школьны куратар цынічна заяўляе, што **сучаснае становішча ў справе падрыхтоўкі беларускага настаўніцтва для беларускіх школ «зусім здавальняючае».** Фашысцкі кат мае рацыю. На што патрэбны беларускія сэмінарыі і беларускія настаўнікі, **калі няма ні аднэй беларускай школы.**

З гэтага інтэрв'ю школьнага куратара зусім выразна відаць, што па працягу бліжэйшых тыдняў **ад беларускага школьніцтва застануцца адны толькі ўспаміны.** На фоне гэтага фашысцкага тэрору з яшчэ большай агіднасьцю вырысоўваецца здрадніцкая роля беларускага нацыянал-фашызму **ў разгроме культурна-асьветных беларускіх арганізацый і ліквідацыі рэштак беларускага школьніцтва.**

Разгром ТБШ, забарона зьезду гэтага таварыства, арышт дэлегатаў выклікалі хвалю абурэньня і бурныя дэманстрацыі працоўных па ўсёй Заходняй Беларусі.

Пралетары і працоўныя БССР пільна сочаць за падзеямі, што адбываюцца на акупаванай Зах. Беларусі. Хваля пратэсту, якая з кожным днём падымаецца ўсё вышэй па гарадох і вёсках Савецкай Беларусі, паказвае, што **працоўныя Зах. Беларусі ў сваёй барацьбе супроць фашысцкай дыктатуры не адны.**

БЕЛАГВАРДЗЕЙСКІЯ ПРЫТОНЫ ПАД ВЫГЛЯДАМ ДАБРАЧЫННЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

ПАРЫЖ, 1-VI. (ТАСС). «Юманітэ» друкуе чарговы артыкул **тав. Маньена** (з сэрыі аб «белагвардзейскіх прытонах»). Тав. Маньен піша, што ў белай эміграцыі ёсьць рад дабрачынных арганізацый **(мэдсёстры, сэкцыі «Чырвонага крыжу»** і інш.), якія прадстаўляюць сабой у сапраўднасьці **дапаможныя атрады агульна-вайсковага саюзу генэрала Мільлера.** У гэтых, нібы, дабрачынных арганізацыях знаходзяць сабе прытулак правакатары і забойцы савецкіх прадстаўнікоў заграніцай. Напрадзі, які забіў у 1923 г. у Лёзане тав. Вароўскага, і іншыя паходзяць з гэтай кухні міжнароднай контр-рэвалюцыі, якая займаецца рэкрутаваньнем людзей у белую армію, ваенным шпіёнажам і антысавецкімі правакацыямі. У 1927 годзе на чале «Чырвонага крыжу» стаяў **Ладыжэнскі—крайні манархіст.** Яго памочнікам быў Палунін—былы ўрангелеўскі афіцэр, які **адправіў Канрадзі з Бэрліну ў Швэйцарыю для падрыхтоўкі замаху на Чычэрына, Красіна і Бэрэнса.** Пасьля нягудачы гэтай спробы Ладыжэнскі загадаў Канрадзі забіць Вароўскага. У лютым 1932 г. Ладыжэнскі ўзначаліў падрыхтоўку замаху ў Жэнэве **на Літвінава.** З арганізацыяй Ладыжэнскага зьвязана контр-рэвалюцыйная міжнародная ліга барацьбы з III Інтэрнацыяналам, якая ўзначальвалася вядомым **Обрам,** што знаходзіўся ў простай сувязі з рускімі манархістамі і мільлераўскім ваенсаюзам.

Далей тав. Маньен піша: **«ліга Обра знаходзіцца ў цясьнейшай сувязі з Бурцавым і ізвольскім і з іх агенцтвам па вырабе антысавецкіх фальшывак.** Уся белагвардзейская прэса, што выходзіць ва Францыі, чэрпае свае антысавецкія бязглузьдзіцы з крыніц жэнэўскай лігі. У выканаўчы камітэт Лігі ўваходзяць многія белагвардзейцы. Ліга фінансуецца капіталістычнымі фірмамі, у прыватнасьці, «торгпромам». Да гэтай арганізацыі далучаюцца ўсе так званыя філянтрапічныя арганізацыі белых эмігрантаў і ў першую чаргу былы царскі «чырвоны крыж».

Тав. Маньен заканчвае артыкул наступнымі словамі: «так ствараюць Гаргуулавых, так кідаюць на правакатарскія акты ўсе антыкамуністычныя сілы, [illegible] і фармацыю [illegible]

Паліцэйскі тэрор у Латвіі ўзмацняецца

Рабочыя дэпутаты кідаюцца ў турму

РЫГА, 1-VI. (ТАСС). На пасяджэньні сойму разглядалася пытаньне аб выдачы для адбываньня 4-хгадовага турэмнага зьняволеньня дэпутата рабоча-сялянскай фракцыі **тав. Янкуса** і аб выдачы судовым уладам дэпутата тэй-жа фракцыі **тав. Межула.** З пратэстам супроць выдачы тав. Янкуса выступіў старшыня рабоча-сялянскай фракцыі **тав. Судмал,** указаўшы, што патрабаваньне аб выдачы Янкуса—акт палітычнай расправы буржуазіі са сваім клясавым праціўнікам. Тав. Янкус асуджан да 4-х год зьняволеньня ў крэпасьць па цэлым радзе спраў, у тым ліку **за сваё выступленьне супроць пагрозы вайны, у сувязі з падзеямі на Далёкім Усходзе.** Характэрна для цяперашняга становішча—заявіў тав. Судмал—што імёны ў момант абвастрэньня становішча на Далёкім Усходзе буржуазія патрабуе зьняволеньня тав. Янкуса ў турме.

46 галасамі супроць 36 сойм пастанавіў выдаць тав. Янкуса.

Па пытаньні аб выдачы тав. Межула выступіў дэпутат рабоча-сялянскай фракцыі **тав. Яршоў,** які ўказаў, што пастанова аб выдачы левых дэпутатаў азначае **пачатак ліквідацыі ўсёй фракцыі па ўказцы паліцэйскіх улад.** «Ліквідацыя рабоча-сялянскай фракцыі,—заявіў тав. Яршоў,—падрыхтоўвалася ўжо даўно ў друку. Арышт левых дэпутатаў зьяўляецца падрыхтоўкай буржуазіі да вайны, у ключэньнем яе ў антысавецкі фронт і сур'ёзным крокам на шляху да фашызму». Тав. Яршоў напамінае, што ў 1914 г. у пачатку імпэрыялістычнай вайны бальшавіцкая фракцыя 4-ай дзяржаўнай думы таксама была арыштавана і адпраўлена ў Сібір. Аднак, яна была вызвалена рабочымі ў 1917 г. «Тое-ж самае,—заканчвае тав. Яршоў,—будзе і з рабоча-сялянскай фракцыяй латвійскага сойму, прадстаўнікі якой цяпер арыштоўваюцца буржуазіяй».

Нават сацыял-дэмакрат Цэленс павінен быў прызнаць, што ўся справа супроць тав. Межула складзена на аснове паказаньняў правакатараў, зьвязаных з паліцыяй. Цэленс указвае, што нават у царскі час на падставе такіх «даных» суд не прызнаваў магчымым асуджваць абвінавачаных. **Большасьцю 47 галасоў супроць 38 сойм пастанавіў выдаць і тав. Межула суду.**

Урадавы крызіс у Германіі

Урад Брунінга падаўся у адстаўку

За 26 месяцаў кіраўніцтва **Брунінга** беспрацоўе ў Германіі павялічылася **з 3,1 да 6,1 млн. чалавек** (паводле афіцыяльнай статыстыкі); коль касьць беспрацоўных, якія атрымліваюць страхавую дапамогу, зьменшылася **з 68 проц. да 26 проц.;** скараціліся разьмеры дапамог; зарплата за пятых рабочых зьменшылася **на 33 проц.,** а штотыднёвы сярэдні даход прамысловых рабочых пры выліку на беспрацоўных і падаткаў, упаў з **42,20 да 22,45 марак.**

За 26 месяцаў кіраўніцтва **Брунінга** манапалістычныя банкі, цяжкая прамысловасьць і прускія юнкеры атрымалі для выратаваньня сваіх прагараючых прадпрыемстваў **мільярды марак, выпампаваных з галадаючых нарэдных мас.** Такава была сацыяльная сутнасьць палітыкі ўраду Брунінга, гэтага ўраду надзвычайных дэкрэтаў і эксплёатацыі працоўных у карысьць капіталістаў.

Крызіс і беспрацоўе вядуць германскі капіталізм да катастрофы. Прычыну крайняга абвастрэньня эканамічнага крызісу германская буржуазія ўсё яшчэ бачыць толькі ў «высокай» зарплаце рабочых і ў «непасільным цяжары» сацыяльных расходаў, да зьнішчэньня якіх яна імкнецца ўсімі сіламі. Урад Брунінга, які апіраўся на сацыял-дэмакратыю, уладаў выстарчальнай сілай для таго, каб правесьці новае адкрытае ограбленьне рабочай клясы пры дапамозе дзяржапарату. Урад Брунінга не аўладаў таксама выстарчальным аўтарытэтам у колах германскай буржуазіі для таго, каб абараняць яе інтарэсы на Лёзанскай канфэрэнцыі. Таму ён павінен быў адыйсьці і ўступіць месца ўраду, які будзе прабаваць вырашаць «праклятыя пытаньні» германскай буржуазіі больш вострымі сродкамі.

Новы ўрад будзе ўрадам цяжкай прамысловасьці і юнкерства з бліжэйшым удзелам генэралаў рэйхсвэру, які маюць усе сродкі тэрору для душэньня супраціўленьня працоўных.

Гэты ўрад напамінае аб вільгельмаўскай імпэрыі ня толькі тым, што ён складаецца з прадстаўнікоў тыхжа клясаў, якія знаходзіліся на чале ўлады да лістападаўскай рэвалюцыі, але і сваім пэрсанальным складам. Ён апіраецца на шматмільённую армію прыхільнікаў нацыянал-сацыялістычнай фашысцкай партыі, выкарыстоўвае супроць працоўных мас, акрамя рэйхсвэру і паліцыі, таксама фашысцкія баявыя арганізацыі—гэтага дзецішча ўсеагульнага крызісу капіталізму.

«Беспартыйны» імпэрскі **ўрад генэралаў, юнкераў і прамыслоўцаў** будзе апірацца на мясцовыя нацыянал-сацыялістычныя ўрады, якія маюць у сваім распараджэньні вялізарнейшы партыйны і баявы фашысцкі апарат. Не падлягае сумненьню, што **сацыял-дэмакратыя будзе «цярпець» і гэты ўрад Папена-Шлейхэра, як «меншае зло» ў параўнаньні з магчымым урадам Гітлера,** як урад «законны» і «канстытуцыйны». Яна ўжо зараз паказвае, што не палітыка за падтрыманьне кандыдатуры Гіндэнбурга, паставіўшага на чале ўлады фашыстаў, была правільнай, бо Гіндэнбург забясьпечыў «канстытуцыйнасьць» і «законнасьць» новага ўраду. Але гэта «канстытуцыйнасьць» і «законнасьць» падводзіць Германію нічыльна да фашысцкай дыктатуры. Працоўныя масы Германіі аказваюцца твар да твару з урадам адкрытай рэакцыі, у праграму якога ўваходзяць нябывалае яшчэ прыгнечаньне працоўных мас Германіі.

Асновай праграмы новага германскага ўраду ў галіне ўнутранай палітыкі будзе бязьлітаснае далейшае наступленьне на рабочыя масы. Ужо цяпер ясна, што адным з першых і важнейшых мерапрыемстваў гэтага ўраду будзе **зьнішчэньне страхаваньня па беспрацоўі і перавод беспрацоўных, якія яшчэ атрымліваюць страхавую дапамогу, на дабрачынную дапамогу, якая ў сувязі з катастрафічным фінансавым становішчам нічым не забясьпечана.** Ужо цяпер ясна, што адным з важнейшых мерапрыемстваў гэтага ўраду будуць далейшае зьніжэньне зарплаты і скасаваньне калдагавароў. Іменна гэтыя ўнутрыпалітычныя мерапрыемствы прымусілі германскую буржуазію на даным этапе адмовіцца ад простага падтрыманьня з боку сацыял-дэмакратыі і рэфармісцкіх прафсаюзаў, якія такое падтрыманьне маглі-б аказаць, толькі рызыкуючы страціць увесь свой уплыў у масах. Германская буржуазія адважваецца замяніць ашуканьне, як пераважны сродак для задушэньня супраціўленьня мас і ўтрыманьня свайго клясавага панаваньня тэрорам, як пераважным сродкам для тэй-жа мэты.

Але ці ўдасца германскай буржуазіі выканаць гэты плян і стварыць такім шляхам выхад з крызісу—гэта залежыць перш за ўсё ад германскага пралетарыяту.

Не падлягае сумненьню, што прыход да ўлады нацыянал-сацыялістаў у рашаючых частках германскай рэспублікі выкліча буру абурэньня ў працоўных масах і прывядзе да пераходу пад сьцягі кампартыі новыя масы рабочых («Правда»).

Лягер адкрыт, баявая вучоба пачалася

Дзень абіцаў быць ярка сонечным. Лёгкі ветрык забаўляўся па вяршынях дрэў. Багатая прырода песьціла разбуджаных ад сна байцоў і камандзіраў.

Лягер **самарцаў** ажываў. У палкох рыхтаваліся пайсьці на бліжэйшы дачны паўстанак сустракаць шэфаў. Палкавыя аркестры, запасіўшыся альбомамі нот, узброіўшыся інструментамі, станавіліся ў галаву сустракаючых калён.

* * *

За лісьцьвеным плотам пачуўся рэзкі сьвісток паравоза. Паўстанак, песна кошны ад вясёлых гутарак, рыхтаваўся да ўрачыстасьці. Падышоў цягнік, пачуліся бадзёрыя маршы чатырох аркестраў. Гукі медных труб перапляліся з грукатам калёс і шумам паравоза. Цягнік спыніўся. Пераблыталіся зашчытныя гімнасьцёркі з белымі, чорнымі, галубымі, ружовымі колерамі грамадзянскіх гарнітураў. Стракатасьць шчаміла вочы. Доўгая рознакалёровая чарада шэфаў і байцоў узьнялася на ўзгорак і патанула ў лесе.

* * *

Пад пякучымі прамянямі майскага сонца змыкаліся вакол трыбуны, упрыгожанай зеляніной, стройныя калёны часьцей дывізіі. Па зялёным пляцы, у розных кашцох раскінуліся шэфы.

Адкрывае мітынг камандзір дывізіі.

— Вітаю вас, таварышы, з пасьпяховым заканчэньнем зімовай вучобы. У летні, лягерны пэрыяд навучаньня, кожны баец, з начальніцкім складам на чале, павінен добра аўладаць вядзеньнем агню, разумець узаемадзейнасьць розных родаў войск, поўнасьцю аўладаць новым курсам стрэльб, яшчэ лепш аўладаць ваеннай тэхнікай і добра дастасоўваць яе ва ўсіх відах бою.

Прамова камандзіра—праграма баявых дзеяньняў. Тут, на пляцы, баец, камандзір і палітработнік атрымалі новую зарадку энтузіязму і ўпэўненасьці ў свае сілы і перамогі на фронце вайсковага ўдасканаленьня і палітычнай загартаванасьці, адданасьці партыі і пралетарыяту ў абароне цьвярдынь Кастрычніка.

Гаворыць намесьнік старшыні СНК БССР тав. **Калнін.** Прадстаўнікі рабочых шэфаў запэўнілі байцоў і начскład у тым, што, ідучы па шляху Леніна, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, на чале з тав. **Сталінам** — пралетарыят і калгаснае сялянства будуць упарта біцца за пасьпяховае заканчэньне пяцігодкі за чатыры гады і падвесьцірацъ тэмпы па выкананьні намечаных плянаў на другую пяцігодку.

Шчыра і цьвёрда ад імя байцоў і начскладу дывізіі адказаў прадстаўнік партыі і ўраду і выступаўшым шэфам чырвонаармеец т. **Заслаўскі.**

— Мы, байцы і начскład, даем слова, што тыя задачы, якія вы, ад імя партыі і пралетарыяту паставілі перад намі — з гонарам выканаем.

Голаснае, дружнае, шматразовае «ура» пацьвердзіла сказанае тав. Заслаўскім.

* * *

У часе грамадзянскай вайны партыя кінула лёзунг: «Пралетары на каня». Коньніца Будзённага рабіла легендарныя гераічныя ўчынкі, пакінуўшы слаўны сьлед на старонках гісторыі грамадзянскай вайны.

Войскі маладой Савецкай рэспублікі, пасаджаныя на каня, направа і налева зьнішчалі варожыя банды. Нашы коньнікі, адданыя сваёй клясе і справе партыі, моцна сядзелі на конях. Яшчэ мацней сядзець на конях яны зараз. Новая перадышка дазволіла нашаму коньніку патрэніраваць сябе, каб у патрэбны момант, па першым закліку партыі і рабоча-сялянскага ўраду ўпісаць новыя старонкі ў баявое мінулае Чырвонай коньніцы.

Конна-спартыўныя спаборніцтвы, якія адкрыліся пасьля ўрачыстага мітынгу, не маглі адарваць ад сябе тысячы прыкаваных вачэй. Першая група спаборніцтва па пяцібор'і. Ад кожнага палка былі ўзяты па 5 чалавек.

Вось выяжджае чырвонаармеец артылерыйскай часьці **Адзінонаў.** Яго конь—сібірак, ходзіць у загароджаным манежы з лёгкасьцю пыркай ластаўкі.

— Гэта-ж наш, родненькі, надпэфны. А ну вазьмі, міленькі, вазьмі — голасна гаворыць старэнькая работніца.

Фанфара сыгналіста прайграла адбой спаборніцтвам першай групы. Судзьдзі пацягнуліся на ўзгорак да стала пад чырвоным матар'ялам. Кіраўнік спаборніцтва падагуліў вынікі. Першае месца заняў чырвонаармеец т. **Адзінокаў.** Другое месца — **Чукачэнка** і трэцяе — **Баранецкі.** Спаборніцтва начскладу праходзіла па дзесяцібор'і. Камандзіры паказалі клясныя рэзультаты язды, высокую якасьць аўладаньня канём.

Лягер адкрыт, вучоба пачалася. Абавязак кожнай грамадзянскай арганізацыі [illegible] дапамагчы гэтай вучобе.

ЛАВР. ХАМЕНШЧУК.



На спаборніцтвах у дзень урачыстага адкрыцьця лягераў

Апошнія вестні з фронту індустрыялізацыі

„Серп и молот" скансструяваў больш лёгкі тып малатарні

ХАРКАЎ.

Харкаўскі завод сельгасмашынабудаўніцтва «Серп и молот» скансструяваў новы тып малатарні, дасягнуўшы пры гэтым вялікай эканоміі мэталю.

Выпрабаваньні паказалі, што новая малатарня па сваіх якасьцях нікольні не адрозьніваецца ад ранейшай. Зараз завод пераходзіць на выпуск новых малатарань больш лёгкага тыпу, што пры выкананьні праграмы бягучага году дасьць эканомію больш 10.000 тон гатункового і ліставога жалеза і 1.300 тон чыгуну. На пабудову корпусу старой малатарні патрэбна было 1.474 кгр. гатункового жалеза, на корпус новай малатарні патрэбна толькі 750 кгр. жалеза.

У Казакстане адкрыта буйнае месцанараджэньне цынку

АЛМА-АТА. Недалёка ад капальні Кантагі (Казакстан) ударнікам дасьледчых партый **Маргалінам** знойдзена буйнае месцанараджэньне цынку. Па папярэдніх падліках устаноўлена, што месцанараджэньне мае 15,5 млн. тон цынкавай руды з паяўнасьцю цынку ад 3 да 4 проц., або 472 тыс. тоны мэталю. Па сваіх запасах месцанараджэньне цынкавай руды стаіць на другім месцы ў СССР. Руда ляжыць на паверхні, што дазваляе праводзіць работы адкрытымі кар'ерамі.

Новыя запасы мэргалю і крэйды

КІЕЎ. У Поўгарад-Северскім раёне знойдзены магутныя запасы мэргалю, крэйды, керамічнай гліны і песчаніку. Райпляпбюро ставіць пытаньне аб пабудове магутнага камбінату партляндзкага цэмэнту з вытворчай праграмай у 2 млн. бочак у год.

Сельгасмашыны

Віцебскі завод «Чырвоны мэталіст» 29 мая выпусьціў 14 экспартных плугоў, што складае 108,2 проц. заданьня, 22 карнярэзкі — 105,7 проц., 17 жмыхадрабілак — 101,8 проц., 1 балотны плуг — 58,8 проц. і 12 бульбакапалак — 41 проц.

30 мая выпушчана: 20 жмыхадрабілак — 119,7 проц. заданьня, 2 балотныя плугі — 117,6 проц., 22 карнярэзкі — 105,7 проц., 12 экспартных плугоў — 92,4 проц. і 11 бульбакапалак — 37,6 проц.

* * *

За 3 дні — 29, 30 і 31 мая **завод «Гомсельмаш»** выпусьціў 96 сіласарэзак «Напек» (заданьне 99), 58 сячкарань (заданьне — 55,5), 10 канюшынасартовак (заданьне — 12), 5 бульбасартовак (заданьне — 51) і 2 бульбамыйкі (заданьне — 29).

Будматар'ялы

29 мая дрэваапрацоўчы **камбінат «Камінтэрн»** расьпілаваў 178,4 кбм. сырцу, што складае 100,5 проц. заданьня.

31 мая расьпілавана сырцу 220,5 кбм. — 121 проц.

* * *

253,2 кбм. сырцу (87,9 проц. пляну) расьпілаваў **лесазавод імя Халтурына** 28 мая.

* * *

Завод «Чырвоны Кастрычнік» 30-га мая замест прадугледжаных плянам 6.880 кгр. цьвікоў будаўнічых выпусьціў усяго 3.520 кгр. (53,8 проц. пляну).

НА БАБРУЙСКІМ ДРЭВААПРАЦОЎЧЫМ КАМБІНАЦЕ

Паасобныя цэхі бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату далі наступныя паказальныя работы за май месяц: лесацэх выканаў праграму на 81,3 проц. (расьпілавана 18.066 кбм. сырцу), завод № 7 на 95,4 проц. (расьпілавана 6.593 кбм.), беладрэўны цэх — на 90,1 проц. (выпушчана прадукцыі 38.120 кбм.), завод № 6 на 71,1 проц. (расьпілавана сырцу 3.580 кбм.) і цэх стандартных дамоў выканаў праграму на 67.2 проц. (выпушчана 56 дамоў).

На 1-й БелДРЭС

30 мая на 1-й Белдрэс выпрацавана 143.000 клв.-гадзін электраэнэргіі, што складае 85 проц. заданьня. Максымум дасягнуў 7.500 кілёват, мінімум — 5.200 клв., сярэдняе — 5.958 клв. Разгрузак 30 мая ня было.

На менскай электрастанцыі

Менская электрастанцыя за 3-ю дэкаду мая выпрацавала 723.398 кілёват-гадзін электраэнэргіі, што складае 92,6 проц. плянавага заданьня.

Угнаеньні

Крычаўскі фасфарытны завод за 5-ю пяцідзеўку мая вырабіў 392 тоны фасфарытнай мукі, што складае 84,3 проц. пляну.

Папера

Паперовая фабрыка «Спартак» 29 мая выканала прамфінплян на 80,9 проц. Выпушчана паперы 15,3 тоны, замест 17,7 тоны паводле пляну.

30 мая выраблена 13,1 тоны паперы — 67,6 проц. дзеннага заданьня.

Менгарком КП(б)Б склікае 5 чэрвеня, у 6 гадзін вечара, у памяшканьні ДОМУ КАМАСЬВЕТЫ

1-ю менскую гарадзкую канфэрэнцыю парторгаў.

Сакратаром партканцылярыі і ячэек (вытворчых, транспартных і будаўнічых) прапануецца зьявіцца ў Гарком з 3-5 чэрвеня з 10-4 гадзін дня ў пакой № 4 за атрыманьнем мандатаў і білетаў.

Паведамленьні

— Рэдакцыя газэты «Орка» і Галоўмастацтва склікаюць сёньня, 4 чэрвеня, у 7 гадз. веч., у памяшканьні рэдакцыі «Оркі» (Савецкая, 63, 2-гі паверх) **нараду па пытаньнях разьвіцьця польскага пралетарскага мастацтва і мастацкага абслугоўваньня польскага працоўнага насельніцтва.** На нараду запрашаюцца ваступныя т. т.: Вітко́ўскі, Кукелка (ВАН), Яфімаў, Яфімава, Квяткоўскі, Даяржынская (НКА), Любан (Радыёцэнтр), Казакоў, Гіттарц (Музтэхнікум), Каліноўскі (польпэдтэхнікум), Клыс (Нацкамісія), Малчанаў (НКА), кіраўнік аркестру польскага клюбу і ўсе іншыя таварышы, якія цікавяцца разьвіцьцём польскага пралетарскага мастацтва.

— 4 чэрвеня, у 6 гадз. увеч., у памяшканьні ЦК ЛКСМБ (былы Дом Калгасьніка), у пакоі № 11 адбудзецца пасяджэньне цэнтральнага штабу па правядзеньні 10-годзьдзя піянэрскай арганізацыі. На штаб павінны зьявіцца члены штабу: НКАсьветы — т. Платуч, ЦСПСВ — т. Кавалёў, НКАховы Здароўя — т. Марозаў, ВСФК — т. Кузьняцоў, «Чырвоная зьмена» — т. Макарэвіч, «Піянэр Беларусі» — т. Рэйдэр, ед ЦК КП(б)Б — т. Пашкевіч. На штаб запрашаюцца прадстаўнікі ад газэт «Зьвязда», «Рабочий», «Савецкая Беларусь», «Орка» і «Акцябр».

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" Ад суботы, 4 чэрвеня

НОВЫ САВЕЦКІ ПРЫГОДНІЦКІ ФІЛЬМ

БОМБІСТ

Рэвалюц. эпапэя ў 6 частках.

Рэж. В. Журавлёў. Апэратар Н. Строд.

ШТОДЗЕННА 4 СЭАНСЫ.

Пачатак у 6, 7-30, 9 і 10-30.

КАСА—ад 4 гадзін.

ДЗЕЦІ Ў КІНО НЕ ДАПУСКЛЮЦЦА.

Інтэрнацыянал — Амэрыканскі мастацкі фільм МАУЧАЦЬ (Бязбожніца) Звыш праграм. Кіно-хроніка

Пралетары — ЗДРАДНІК Кіно-раман у 8 частках

Спартак — Пач. 7-15, 9, 10-45 Каса—ад 5 г. — МАСТАЦКІ ФІЛЬМ КРУГ Драма ў 7 частках.

ПРЫЁМ новых вучняў на 1932/33 навучальны год у „О" і 1 групы сямігодак і 4-годак

гораду Менску і Менскага раёну

Устаноўлены з 1 па 10 чэрвеня 1932 г.

У „О" групы прымаюцца дзеці, якія маюць на 1-VI г.г. ня менш 6 з пал. год і ў 1 групу, якія маюць ня менш 7 з пал. год.

Запіс гэтых дзяцей у школу праводзіцца кожнай школай ад 10 да 14 гадзін і ад 16 да 19 гадзін штодзенна.

Пры запісу прадстаўляць матрыцу і прытрымлівацца школы свайго раёну (у горадзе).

Менгарана.

СКРЫГАЛАЎСКІ С.-Г. ТЭХНІКУМ

КОРМАЗДАБЫВАНЬНЯ

абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР на 1-шы курс.

Дакументы на агульных падставах падаваць да 1-га верасьня г. г. па адрасе:

м. Скрыгалаў, Пятрыкоўскага раёну, тэхнікуму.

Інтэрнатам забясьпечваюцца ўсе студэнты, а стыпендыямі на агульных падставах.

Заняткі пачынаюцца з 1-га кастрычніка г. г.

Дырэктар тэхнікуму МАСАНІН.

АБ'ЯДНАНЬНЕ ГАТОВАГА АДЗЕНЬНЯ

БЕЛКААПСАЮЗУ

ПРЫМАЕ ПА ОРДЭРАХ ЭРК

індывідуальныя заказы на пашыўку гатовага адзеньня

ў наступных пунктах:

Менск, крама № 1. Ленінскай, 11.
Віцебск, крама № 8. Вакзальная, 28.
Гомель, крама № 11. Савецкая, 14.
Магілеў, крама № 10, вуліца 1-е мая, 31.
Бабруйск, крама № 12, Сацыялістычная, 110.

Заказы з матар'ялу заказчыкаў прымаюцца без ордэраў.

АБ'ЯДНАНЬНЕ ГАТОВАГА АДЗЕНЬНЯ БЕЛКААПСАЮЗУ.

5 чэрвеня, у 7 гадз. веч., у Інстытуце эканомікі Беларускай Акадэміі Навук АДБУДЗЕЦЦА НАРАДА ГЕОГРАФАЎ па абгаварэньні фізычнай карты БССР. Запрашаюцца ўсе географы. Дырэкцыя інстытуту эканомікі БАН.

Белдзяржлугтрэсту ПАТРЭБНЫ: 3 грузавыя аўтамабілі грузападъёмнасьцю ад 1,5 да 2,5 тон, 1 лёгкавы і 2 матацыклі. Можна з невялікім рамонтам. З прапановамі зьвяртацца —Савецкая вул., 57, тэл. 7-08.

Белзаготэкспарту патрэбны для работы ў Менску: 1) эканаміст-плянавік, 2) галоўбухгальтар, 3) бухгальтарскія работнікі, 4) машыністка-стэнаграфістка. УМОВЫ ПА ЗГОДЗЕ. Зварачацца па адрасе: Менск, Пляц Волі № 7, ад 12 да 2-х гадз.

На падставе пастановы ЦКК РСІ ад 16-V—32 г. пры Мен. Гар. КК РСІ арганізавана бюро скаргаў па ўсіх пытаньнях і скаргах гор. Менску і яго раёну. Зварачацца па адрасе: г. Менск, вул. Карла Маркса № 14, пакой № 10.

ЗАВОЧНЫ СЭКТАР ВЫШЭЙШАГА ПЭДІНСТЫТУТУ абвяшчае АСЕНЬНІ ПРЫЁМ на наступныя аддзяленьні: літаратурнае, гістарычнае, эканамічнае і пэдагагічнае. Прымаюцца рабочыя, калгаснікі, сяляне і служачыя, якія маюць сярэдняе асьвету. Прыём заяў да 1 верасьня г. г. па адрасе: Менск, Універсытэцкі гарадок, завочны сэктар ВПІ. При заяве неабходна прыкласьці наступныя дакументы: аб асьвеце, сацыяльным паходжаньні, месцы працы і заверэную анкету. Завочны сэктар ВПІ.

Менск, друкарня «Зьвязды» Галоўлітбел № 337